# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 8 (2545) Год L | Беласток, 20 лютага 2005 г. | Цана 2,00 зл.




*Кіеў мацуе беларускі дух* ☞ 3

ЯН САЕВІЧ ☞ 5



*БАС выступае ў падтрымку пратэсту супраць абмежавання эфірнага часу ў Радыё Беласток для нацыянальных меншасцей ды пратэстуе супраць рэпрэсій накіраваных у бок рэдакцыі „Нівы"...*

# БАС узмацняецца




Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Галоўная рада Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы; трэцяя злева — Ілона Карпюк (старшыня)*

Адраджаецца, пасля гадоў застою, Беларускае аб'яднанне студэнтаў. Наколькі ў апошнія гады энергія арганізацыі засяроджвалася на „Басовішчы", „Атрасінах" і рэйдзе „Бацькаўшчына", зараз — як адзначае шэфіха арганізацыі, Ілона Карпюк — напрамак дзейнасці дадаткова накіраваны ў бок супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі. Вось у 2003 і 2004 гадах, супольна з Міжнародным навуковым гуртком *Albaruthenica*, БАС ладзіць „Беларускія дні" ў Варшаўскім універсітэце. Разам з Інстытутам беларускай культуры — „Беларускае калядаванне". Традыцыяй Варшаўскага універсітэта з'яўляецца ўжо музычнае мерапрыемства „Беларускі Underground". Сустрэчы з беларускай музыкай, фільмам, кулінарыяй накіраваны не толькі ў бок беларускіх студэнтаў, мерапрыемствы наведваюць сімпатыкі іншых нацыянальнасцей, нараджаецца супрацоўніцтва. Разам з Беларускім самаўрадавым форумам і Звязам беларускай моладзі БАС арганізуе першыя моладзевыя станіцы, якія летась праходзілі ў Кленіках, Сацах, Дубічах-Царкоўных, Орлі. Пад кірункам студэнтаў бельскія і гайнаўскія белліцэісты і гімназісты даследуюць гісторыю і фальклор Беласточчыны. БАС дапамагае ў арганізацыі канцэртаў моладзі мінскага Ліцэя імя Якуба Коласа. Многа ўвагі адводзіцца прамоцыі ўласнай арганізацыі. Самы вялікі поспех у гэтым напрамку — удзельніцтва ў агульнапольскай прэзентацыі фільма „Васемнаццаць" (гісторыя аднаго кахання на фоне „Басовішча 2003").

БАС выступае таксама ў падтрымку пратэсту супраць абмежавання эфірнага часу ў Радыё Беласток для нацыянальных меншасцей, пратэстуе супраць рэпрэсій накіраваных у бок рэдакцыі „Нівы". БАС уключыўся ў Камітэт пабудовы помніка Янку Купалу і Якубу Коласу ў Варшаве. Гэта асноўныя праекты і дзеянні, рэалізаваныя на працягу апошняй кадэнцыі 2003-2005 гг. студэнтамі, у асноўным Варшаўскага універсітэта.

11 лютага г.г. у Беластоку адбыўся агульнапольскі з'езд БАСу. Апрача мерытарычнай справаздачы, былі абраны новыя ўлады і назначаны накірунак дзейнасці. Старшынёй другі раз запар дэлегаты абралі Ілону Карпюк — студэнтку чацвёртага курса сацыялогіі ВУ. За ёю прагаласавала больш за 80 працэнтаў дэлегатаў. Старшынёй Галоўнай рады стаў Радаслаў Дамброўскі — студэнт трэцяга курса беларускай філалогіі ў Беластоку. У Галоўную раду ўвайшлі: Ігар Іванюк (сакратар), Нікан Шарамэта (скарбнік), Міхась Грэсь, Рафал Андрасюк, Андрэй Курчук, Тамаш Суліма, Ганна Чаламей. Рэвізійную камісію састаўляюць: Міхась Віктарук (старшыня), Марк Баранскі (намеснік), Іаанна Якубовіч.

— Зараз у нас каля 70 членаў, — кажа Ілона Карпюк. — Самую вялікую групу складаюць студэнты беластоцкай беларусістыкі (як і ў абраных зараз уладах). Гэта добры сігнал для арганізацыі. Наколькі супрацоўніцтва паміж Варшавай і Беластокам праяўлялася адно ў арганізацыі „Басовішча", зараз нашым прыярытэтам будзе аб'яднанне паміж асяродкамі.

Адсутнасць кантактаў на беластоцка-варшаўскім грунце Ілона Карпюк лічыць самай вялікай паразай мінулай кадэнцыі.

— Спачатку наладзім супольную імпрэзу, — кажа Радаслаў Дамброўскі, не менш зацікаўлены ў аб'яднанні двух БАСаў.

Уже неўзабаве супольна арганізуюць беларускі фільмавы вечар і канцэрт у рамках праекта „Памост" на сродкі Управы горада Беластока.

— А можна лепш, — жартуюць удзельнікі з'езда, — аб'яднанне пачаць ад нейкага варшаўска-беластоцкага сужонства! Здаецца, будуць праблемы; сучасны БАС — у асноўным мужчынскі пол!

**Ганна Кандрацюк**

## *Прапаганда поспеху* ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Прадпрымальнікі — дастаткова незалежная і згуртаваная супольнасць. Ёй цяжка маніпуляваць. Яшчэ цяжэй кантраляваць гэтых людзей. І практычна немажліва прадказаць іх паводзін. Таму, мяркую, уладу наўрад ці засмуціла б, каб дробнае і сярэдняе прадпрымальніцтва знікла зусім, разам з іх падаткамі, таварамі і рынкамі...*

## *Мроі пра Усход* ☞ 2

Сакрат Яновіч

*Перастаньце нэндзіць: Вільня і Львоў, Львоў і Вільня! Надакучыла слухаць гэту дзяцінпасць. І не дурыце галавы маладым палякам. Няхай жывуць яны ў багатым Гданьску, прыберлінскім Шчэціне, Вроцлаве, замест сніць пра літоўскую Вільню і ўкраінскі Львоў, важныя Літве і Украіне, і зусім няважныя Польшчы, яе дзяржаўнаму бюджэту...*

## *Войнаўка* ☞ 4

Аляксей Мароз

*Пасля вайны моцна пільнавалі мяжу і нават цяжка было падысці да яе. Спачатку мы думалі, што граніца адменіцца і таму шанавалі поле, якога ўласнікі былі за мяжой. Нашае поле, што засталося ў Савецкім Саюзе, таксама абрабляці. Нашыя жыхары рэдка ездзілі да сваякоў, што засталіся ў Беларусі. Зараз, калі лягчэй дабрацца за мяжу, няма ўжо да каго ехаць...*

## *Лявон Вольскі* ☞ 8

*Не гучым на радыё і ў тэлебачанні, таму іграем па клубах. Наконт нашых супольных 10 гадоў... Былі яны розныя, бо і ў краіне было па-рознаму. У гэтага рэжыму былі і адлігі свае, і свае ўціскі. Зараз самы жорсткі час, бо ўлады нарэшце рыхтуюцца да прэзідэнцкіх выбараў. Загадалі радыёэфір у 75% зрабіць беларускім і забараняюць радыёстанцыям прэзентаваць нашу беларускую музыку...*

## *Беларускія спартсмены* ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

*Футбольная дружына Беларусі яшчэ больш павысіла свой рэйтынг, перамогшы ў спарынгавай гульні ў гасцях зборную Польшчы — 3:1. У шыхт вярнуўся Аляксандр Глеб і гэта адразу адбілася на патэнцыяле каманды...*

## *Прадалі нас* ☞ 11

Міра Лукша

*А цяпер гэты кавалачак хтосьці купіў. Я нават яго на вочы не бачыў. Купіў ад Агенцтва сельскагаспадарчай уласнасці ў Сувалках. Будзе ўжо тры гады, як з зямлёй купілі і мяне. І я не ведаў бы, калі б не прасіўся памагчы аднавіць крыху маю разваліну. Домік мой нялядны, з коцікам адно там жыву...*

# На фоне прапаганды поспехаў



*Дзесятага лютага па ўсёй Беларусі адбыліся мітынгі дробных прадпрымальнікаў. Гэта была адна з найбольш пратэсных акцый мінулых гадоў. Не працавалі рынкі, блакіраваліся адміністрацыйныя будынкі, выстаўляліся ультыматумы ўладзе. Акцыя набыла агульнарэспубліканскі характар.*

*У Гродне ў папераджальнай акцыі прымалі ўдзел каля чатырох тысяч чалавек. Прадпрымальнікаў не спалохала нават тое, што на некалькі іх збору ўлады заранёў сцягнулі ўзмоцненыя нарады міліцыі. І нават тое, што зусім нядаўна на два гады калоніі былі асуджаны кіраўнікі страйкама прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі і Аляксандр Васільеў (апошні прызнаны вінаватым і ў арганізацыі „групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак”). Не напалохала і тое, што гродзенскі актывіст, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання прадпрымальнікаў „Перспектыва” Змiцер Іваноўскі ўжо збіўся з падліку кольkасці адміністратыўных пакаранняў за арганізацыі несанкцыянаваных акцый. І тое, што напярэдадні быў затрыманы, а ў гэты дзень асуджаны на дзесяць сутак за арганізацыю несанкцыянаванага шэсця старшыня РГА „Перспектыва” Анатоль Шумчанка. Не спалохалі іх і папярэджанні гродзенскай міліцыі. Дайшло нават і да дробнай сутычкі, у якой перамаглі прадпрымальнікі. Яны прарвалі міліцэйскі шыхт і прайшлі да гарвыканкама. Старшыня Гродзенскага гарвыканкама быў змушаны выйсці на перамовы. Ён заклікаў прысутных дзейнічаць у адпаведнасці з заканадаўствам, і на пытанні пра лёс Зміцера Іваноўскага, якога напярэдадні спрабавалі затрымаць супрацоўнікі міліцыі, паабяцаў, што гродзенскія гарадскія ўлады будуць дзейнічаць выключна ў межах заканадаўства.*

*Аналізуючы складўшуюся сітуацыю, задаеш сабе пытанне: адкуль набраўся адвагі і рашучасці рахманы і працавіты беларускі прадпрымальнік, які зусім нядаўна мала цікавіўся палітычнай сітуацыяй, і не зусім ахвотна падтрымліваў масавыя акцыі палітычнай апазіцыі? А зараз выйшаў на вуліцу не толькі з гучнымі выкрыкамі „Далоў падатак на дабаўленую вартасць!”, але і з воклічамі „Свабоду!”.*

*Дробнае прадпрымальніцтва ў Беларусі пачало аднаўляцца адразу пасля зніклення Савецкага Саюза і з набыццём Рэспублікай Беларусь незалежнасці (калі не лічыць гарбачоўскія спробы стварэння кааператываў і іншых нешматлікіх, адносна эканамічна-незалежных суб'ектаў гаспадаркі). Але ўладныя структуры, асабліва на рэгіёнах, разглядалі прадпрымальніцтва як часовую з'яву. На тое, што яно будзе некалі знішчана як НЭП, у іх не было сумневаў. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Прадпрымальнік разглядаўся як „прышч на здаровым целе” цалкам дзяржаўнай, падуладнай наменклатуры сацыялістычнай эканоміі. Але палітычная і эканамічная сітуацыі патрабавалі зменаў, і ў прадпрымальніка з'явілася надзея, што ён зойме ў Беларусі такое месца, якое маюць яго калегі па ўсім вольным свеце. Ён марыў стаць „сярэднім класам”. Класам, які з'яўляецца гонарам і эканамічным стрыжнем дзяржаў з рынкавай эканомікай.*

*Але чаму так не сталася? Чаму дробнае прадпрымальніцтва, якое робіць бізнес мабільным і трывалым, трапіла ў такое незайздроснае становішча ў нас? Навошта прадпрымальнік, замест каб працаваць, мусіць выходзіць на вуліцу і там змагацца за свае правы. Мне здаецца адказ ляжыць на паверхні.*

*Найперш прычына палітычная. Прадпрымальнікі — дастаткова незалежная і згуртаваная супольнасць. Ёй цяжка маніпуляваць. Яшчэ цяжэй кантраляваць гэтых людзей. І практычна немажліва прадказаць іх паводзін. Таму, мяркую, уладу найрад ці засмуціла б, каб дробнае і сярэдняе прадпрымальніцтва знікла зусім, разам з іх падаткамі, таварамі і рынкамі.*

*Другая прычына — эканамічная. Дзяржаве проста трэба грошы. А дзе іх узяць? Адказ просты: у таго, хто ўмее грошы зарабляць. І хоць афіцыйная прапаганда без перастанку распавядае пра неверагодны эканамічны прарыў, на фоне гэтых сцвярджэнняў мітынгуюць дробныя прадпрымальнікі. А якраз яны, а не сухія лічбы росту вытворчасці, ёсць галоўным паказчыкам рэальнага стану дзяржаўнай эканомікі.*

**Віктар Сазонаў (Гродна)**

# Сентыментальная неразумнасць



*Цярпеў я і цярпеў польскі сентыменталізм за стратаю Крэсаў, Вільні і Львова, урэшце прарвала мяне, не стрываў. Чаму яны не думаюць катэгорыямі нацыі і дзяржавы, толькі інтарэсамі Ватыкана ды ўспамінамі шляхецкай імперыі?! Нішто не стаіць на месцы, змяняецца гаспадарчая геаграфія, палітычная таксама. Без страты Крэсаў Польшча не атрымала б заходніх земляў, Шчэціна, Вроцлава, нават Гданьска, не кажучы пра Прусію і цэлы Шлёнск. І пяцьсот берагавых кіламетраў пайднёвае Балтыкі.*

*Смеху вартае параўнованне эканамічнае вагі Крэсаў з заходнімі тэрыторыямі пасляваеннай Польшчы! Бюджэт даваеннае Польшчы трымаўся на патэнцыяле былое Кангрэсоўкі плюс Верхняга Шлёнска. Не здзівіла б мяне, калі б пасля фінансавых аналізаў аказалася, што на ўтрыманне Крэсаў, Вільні і Львова, цэнтральны бюджэт рэгулярна якраз даплачваў. Тым праўдзівей, што на неспакойных Крэсах трэба было мець у чатыры разы больш паліцыі, пачынаючы ўжо ад Беластока і Бельска. Статыстычна беручы, прамысловая прадукцыя на беларускіх Крэсах была амаль у с о р а к разоў меншая, чымсьці ў цэнтральнай Польшчы. Мой бацька, шавец, зарабляў тады два злоты за адзін дзень, адчуваючы сябе шчаслівым у фабрычных на той час Крынках. За такія грошы паляк на Шлёнску ці ў Варшаве мог бы толькі плюнуць на іх. А пра дзікую беднасць нашых вёсак нікому не раскажаш, ніхто з палякаў не паверыць, асабліва цяпер. Захавалася трохі фатаграфій з тае Польшчы на Крэсах: відаць на іх усю марноту тагачаснага быту. Часам здараюцца шчыра напісаныя ўспаміны старых людзей, якія друкуе штомесячны „Часопіс”; маладыя, як бачу тое, не чытаюць іх, здаюцца яны ім чорнымі байкамі.*

*І па такіх Крэсах палякі ў варшаўскім тэлебачанні плачуць, смуткуюць. Вядомыя каментатары Марк Астроўскі, Кшыштаф Мразевіч, Іцэвіч, Шасткевіч... Гэта даводзіць мяне да белае гарачкі! Панове, вы хацелі б, каб Польшча захавала непрадуктыўныя ўсходнія тэрыторыі — ад безнадзейна занядбанага горада Вільні па зяцюканы Львоў ды румынскую галоту на Букавіне? Замест займець індустрыяльны Шлёнск з Валбжыхам, прамысловы Вроцлаў, балтыйскія парты Шчэцін, Калабжэг і Гданьск. Трэба ж думаць, што вы публічна гаворыце!*

*Далучэнне Вільні ў ролі сталіцы Літвы пераўтварыла гэты горад у вялікую ды элегантную еўрапейскую метраполію. А Гродна ніколі не вырасла б у дзесяць разоў, застаючыся ў цяні Беластока, як было тое да вайны (уладам не падабалася гродзенская беларускасць). Не буду згадваць пра Львоў, бо не ведаю ўкраінскай сітуацыі, ніколі там я не бываў.*

*Усяму свая натуральнасць. Вільня і Львоў як праява польскага імперыялізму не маглі развівацца. Гэта былі падкаланіяльныя гарнізонныя гарады і акругі насупраць Расіі, што трэба разумець як цывільную абыякавасць да іх лёсу. Каму ў Варшаве магло залежыць на тым, каб падбаць пра Вільню, каб не абсыпаліся ў ім старыя тынкі, пабрукаваць гладкай косткай ухабістыя вуліцы? Віленскі універсітэт быў самым бедным з польскіх універсітэтаў. Затое была ў тутэйшых палякаў ангельская ганаровасць, што яны цвёрдаю рукою трымаюць за карак мясцовых абарыгенаў, літоўцаў і беларусаў; ваявода Мэйштовіч надта гэтым ганарыўся, пан на тысячах гектараў сваіх маёнткаў. Пытанне толькі, як доўга можна было ганарыцца гэтымі запушчанымі, галоднымі землямі? Магчыма роспачна пажартаваць: бярыце назад Вільню і аддайце немцам Гданьск. Бярыце назад Львоў і аддайце немцам Шчэцін. І т.д. і т.п. Панове, апладзіравалася б вам тое?*

*Пустаслоўе польскага хатняга рэвізіянізму надакучыла!*

*Перастаньце нэндзіць: Вільня і Львоў, Львоў і Вільня! Надакучыла слухаць гэту дзяціннасць. І не дурыце галавы маладым палякам. Няхай жывуць яны ў багатым Гданьску, прыберлінскім Шчэціне, Вроцлаве, замест сніць пра літоўскую Вільню і украінскі Львоў, важныя Літве і Украіне, і зусім няважныя Польшчы, яе дзяржаўнаму бюджэту.*

*Крэсы шмат значылі ў польскай культуры, але не ў гаспадарцы. Сёння гэта бачна ў выглядзе Усходняй Сцяны.*

**Сакрат Яновіч**

**Вачыма еўрапейца**

# Студэнты ў паветраных замках



*Калі ў мінулым годзе адміністрацыя прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі зачыніла Гуманітарны універсітэт у Мінску, улады шэрагу польскіх вышэйшых вучэльняў і самаўрадаў заклараваў дапамогу ў працягванні навучання студэнтамі гэтай школы. Таксама Беласток уключыўся ў гэтае кола, быццам на хвалі нясення дэмакратыі пасля сумніўных прэзідэнцкім рэферэндуме і парламенцкіх выбарах. Падляшская еўрадэпутатка, а заадно рэктар Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі праф. Барбара Кудрыцкая расчыніла вароты гэтай вучэльні дзесяткам студэнтаў.*

*— У Варшаве прэзідэнт Лех Качынскі абяцаў дапамогу гэтым маладым людзям. Я разлічвала на тое, што гэтак стане і ў Беластоку, хоць бы шляхам фундавання гарадскім самаўрадам стыпендыяў. На жаль, у адказ на маё пасланне прэзідэнту Беластока, аказалася гэта немагчымым. Як мне тлумачылі, па фармальна-юрыдычных прычынах. Гэтаксама паінфармавалі мне ў Міністэрстве нацыянальнай адукацыі і спорту, — тлумачылася пару дзён таму „Ніве” праф. Барбара Кудрыцкая.*

*Улады Беластока засланяюцца законам аб гмінным самакіраванні.*

*Сапраўды, спадарыня рэктар зрабіла ўсё, што было ў змозе.*

*Пераканала сенат вучэльні. Звольніла (цяпер адзінаццаціх) мінскіх студэнтаў з аплат (3,5 тыс. злотых у год). Даклала па сто злотых да аплат за месца ў інтэрнаце Беластоцкай Політэхнікі. Рэшту, значыць, па 150 зл. у месяц, студэнты мусяць даплаціць самі.*

*— Рэктар Політэхнікі кажа, што не хапае яму на даплаты да інтэрнатаў нават для бедных польскіх студэнтаў, — кажа праф. Кудрыцкая.*

*Так, вось, нягледзячы на гучныя дэклярацыі і ў выніку на пустыя словы, студэнты Гуманітарнага універсітэта мусяць спраўляцца адны.*

*— Аказваецца, засталіся яны ў паветраных замках, — з горыччу прызнаецца пані рэктар.*

*Тым часам віцэ-старшыня Еўрапарламента Януш Анышкевіч хадайнічае за стварэнне пры Еўрасаюзе спецыяльнага фонду, які меў бы быць „падтрымкай для дэмакратыі ў суседніх краінах, а перш за ўсё ў Беларусі”. Упісваўся б ён у новую еўрасаюзную палітыку суседства і дапамогу ў пабудове адкрытага грамадства таксама і ў Беларусі. Аднак, мае ён ажыццяўляцца толькі з 2007 года. Палітыка суседства і дзейнасць фонду, згодна з прапановай старшыні Анышкевіча, у канфрантацыі з сённяшняй беластоцкай практыкай у адносінах да студэнтаў Гуманітарнага універсітэта гучаць абстрактна. Маладыя беларусы маюць права сумнявацца ў прынцыпах дэмакратычнага адкрытага грамадства, дасведчыўшы супярэчлівасць паміж практыкай і дэклярацыямі. Не хочацца мне верыць у тлумачэнні прэзідэнта Беластока, выказаныя вуснамі ягонага прэс-інфарматара, аб немагчымасці фундавання маладым беларусам стыпендыяў. Нават калі гарадскія юрысты пераконваюць, што гэта немагчыма, бо не дазваляе на гэта закон аб гмінным самакіраванні, то ёсць яшчэ шмат спосабаў, каб ім дапамагчы. Вось, мог бы прэзідэнт, як установа, звярнуцца з адпаведным заклікам да арганізацый, таварыстваў ці бізнесовых асяроддзяў, якія супрацоўнічаюць з гарадскім самаўрадам. Аднак, права-каталіцкі прэзідэнт разводзіць рукамі. Ці можа толькі таму, што гэта датычыць беларусаў?*

**Мацей Халадоўскі**

*На Майдан Незалежнасці дабіраемся на метро. Тут яшчэ пуставата, пляц запаўняецца пасля абеду. На прылаўках пад блакітным марозным небам прадаюцца рэквізіты Аранжавай рэвалюцыі: шалікі, аўтаручкі, кубкі, кашулькі...*

# Кіеў мацуе беларускі дух

Наш знаёмы кантрабандыст з-пад Луцка, якога мы зноў выпадкова сустрэлі на польска-ўкраінскай мяжы, спачатку не мог паверыць, што бачыць менавіта нас — журналісткі Гандзю і Домну!

Васыль Л. выправіўся ў Польшчу пасля паўтарамесячнага перапынку, якраз як самыя панюсі. Мы нават не адважыліся пракаментаваць здарэнне, але зрабіў гэта наш добры дзядзька:

— *Такая біэнэргетыка дзівчата е!*

Менавіта… наша вандроўка здзяйснялася пад знакам энергетычнай падмацоўкі. Дзень, калі мы перасяклі мяжу ў Ягадзіне, распаліў надзею мільёнаў украінцаў. Тады дэпутаты Вярхоўнай Рады зацвердзілі Юлію Тымашэнку прэм'ер-міністрам. Вынікі галасавання (што паўтарала кожныя дзесяць хвілін Радыё Луцк) ашарашылі нават прыхільнікаў Віктара Юшчанкі. За Юлію Тымашэнку прагаласавалі амаль усе дэпутаты, апрача камуністаў. У суме атрымала яна 373 галасы (мінімум 226) на 450 магчымых.

— Тыя, што былі за Януковычам, ужо павыкідалі старыя білеты, каб зноў бліжэй карыта лыч прыставіць, — хвалюецца Л. Як сапраўдны рэвалюцыянер дамагаецца справядлівасці:

— Юлія зробіць з *імі* парадак! — хваліць спадарыню прэм'ер-міністр наш Васыль.

Прыклад *іх* сам падсоўваецца пад наш нос. Вось на суседнім полі пад'ехала аўтафура пазначаная малюнкам карычневага мядзведзя. Гэта фірменны знак фінансавага алігарха Мэдвэдчука, павязанага з былым прэзідэнтам Леанідам Кучмай. Вядома пра пяцьсот такіх аўтафур з мядзведзем.

— Цяпер яго пад суд паставім, — радуецца Васыль. Пакаранне? Вядома ў духу аранжавай рэвалюцыі — ніякай крыві! Хай толькі верне незаконныя мільярды! Досыць зладзейства! Досыць карупцыі! Васыль ужо бачыць як трэба інвеставаць Мэдвэдчуковыя мільярды. Ён бы аддаў іх мястэчкам і вёскам, дзе співаецца беспрацоўная моладзь.

Тэорыя рэвалюцыйнай справядлівасці яшчэ не ўвайшла ў бізнесовую практыку самога Васыля. Калі перасякаем мяжу, дзядзька раскладае ў тры кучкі „падаркі" (3 х 10 долараў) мытнікам і пагранічнікам. Мы зноў становімся цудадзейным дадаткам да кантрабанды Л. (глядзі рэпартажы ў Ніве н-р 34, 36, 38 за 2004 год) і другі раз загаворваем ненажэрны рот акулам карупцыі. Нашу машыну пагранічнікі быццам і не бачаць. Імчым сабе як паны, аж у сам Ковель. Дзядзька Васыль ловіць *хвалю* і ў такт прарочыць:

— Усе нашы гадалкі і варожкі прадказваюць такую рэвалюцыю яшчэ ў Расіі і Беларусі.

## Пасля перамогі

— *Шановні пасажыры!* — вітаюць нас на Цэнтральным чыгуначным вакзале ў Кіеве (так пачынаецца кожная аб'ява). На вакзале гучыць толькі ўкраінская мова, хоць у аблічках пасажыраў мяшаюцца рысы Еўропы і Азіі. Спалучэнне з Еўропай, калі ідзе пра чыгунку, мізэрнае. Прыгнятальная большасць цягнікоў адпраўляецца ў Маскву.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Майдан Незалежнасці ў Кіеве*

На элегантных сталічных вуліцах, перш за ўсё, гучыць руская мова. Ёсць пэўнае выключэнне — моладзь размаўляе толькі па-ўкраінску. Ды калі станеш размаўляць з выпадковым пешаходам, пакажацца што ён двухмоўны.

На Майдан Незалежнасці дабіраемся на метро (цана квітка амерыканскія 3 цэнты). Тут яшчэ пуставата, пляц запаўняецца пасля абеду. На прылаўках пад блакітным марозным небам прадаюцца рэквізіты Аранжавай рэвалюцыі: шалікі, аўтаручкі, кубкі, кашулькі.

— Покупайте музыку, — намаўляе нас малады гандляр ды прапануе чатыры кампакт-дыскі з „Песнямі з Майдану". За месяц рэвалюцыі нарадзілася каля ста новых песень у стылі рэп, гіп-гоп, тэхна, дыска. Самая вядомая належыць гурту „Грынджолы" — „Разом нас богато" (*Мы нэ быдло, мы нэ козлы./ Мы Украіны донькі і сыны./ Зараз чы ныколы./ Годы чэкаты!/ Разом нас багато — нас нэ подолаты!*). Песні рэвалюцыі нясуць багатую патрыятычную, пацыфістычную, эратычную і экалагічную нагрузкі. На суседнім століку, дзе прадаюцца сцяжкі народаў і значкі з сімволікай, пытаю пра бел-чырвона-белы.

— Ужо няма, — заяўляе гожы хлапец, — бо *швидко* распрадаюцца. Узамен прапануе значок братэрства: два незалежныя сцяжкі ў адным — беларускі і ўкраінскі.

Вуліцай Інстытуцкай дабіраемся пад будынак парламента. Тут таксама адпачываюць пасля перамогі. На месцы топчуцца адно турысты. У Марынскім парку, што насупраць парламента, на бялюткім снезе напісанае крывёй сэрца.

Міжволна думаю пра Алеся Пушкіна і яго карціну-перформенс з Віцебска, які „размаляваў" на белым палотнішчы чырвоную паласу собскай крывёй. Тут жа ў парку знаходзіцца помнік Мікалаю Глінку. А за спінай белы, скуты лёдам, Дняпро, які наклікае чамусьці думкі пра студэнцкія гады Уладзіміра Караткевіча.

Кіеў мацуе беларускі дух!

## У сэрцы старажытнай Русі

Паўз Дняпро, паркам напоўненым радасным смехам і крыкам дзяцей, дабіраемся ў сэрца горада, у Кіеўска-Пячэрскую лаўру. Ля муроў старажытнага храма стаяць гандлёвыя ларкі, на якіх прадаюцца іконкі і малітоўнікі ды рэквізіты Аранжавай рэвалюцыі (Кіеўска-Пячэрская лаўра належыць Кіеўскаму патрыярхату, які афіцыйна заступіўся за Юшчанкам).

У Лаўру, на якую складаецца за 80 будынкаў размешчаных на 27 гектарах, уваходзім з боку манастыра. Наш шлях вядзе ў пячоры з падзямельнымі цэрквамі XI стагоддзя і 120 саркафагамі святых. Пячоры пачалі капаць у 1051 годзе. Памешчаны яны на глыбіні ад 5 да 20 метраў пад зямлёй. У Блізкіх пячорах (228 метраў даўжыні) пакоіцца 75 забальзамаваных святынь манахаў. Тут знаходзяцца рэліквіі заснавальніка Лаўры — св. Антонія Пячэрскага. Побач грабніца легендарнага летапісца Нестара. У Далейшых пячорах сустрэнем святыні Еўфрасінні Полацкай (другая частка святынь беларускай заступніцы знаходзіцца ў Полацку).

Ля мошчаў св. Еўфрасінні, аздобленых свежымі ружамі, што раз спыняюцца паломнікі са свечкамі.

— Это матушка Ефросиния, — паясняе сябру шэптам хлопец, на выгляд семінарыст.

Здзіўленне наведвальніка выклікае полам святой, яна адзіная тут жанчына сярод айцоў праваслаўя.

З васковай свечкай прабіваюся праз вузкія (метр шырыні, два метры вышыні), цёмныя лабірынты. Яшчэ раз прыводзіць нас над грабніцу св. Еўфрасінні. У пячорах, паводле легенды, галовы святых міраточаць цудадзейны алей. Месца прасякнутае атмасферай сярэдневяковага цуду.

На гару, значыць наверх, выходжу з адчуваннем раю ў сэрцы.

## У шапцы танкіста

Моц краіны адлюстроўваецца ў правінцыі, і гэтым разам мы пасмакавалі яе ў экстрэмальным варыянце. У шэсць гадзін раніцы (па польскім часе — пяць гадзін) на вакзале ў Ягадзіне таўпілася хмара народу. Тое, што на двары стаяў блізка 20-градусны мароз, тут не мела асаблівага значэння. Поўным махам працаваў прывакзальны кафэ-бар. За сталом дзядзькі папівалі піўцо і чаравалі нас шырокімі ўсмешкамі. Адзін з іх надзеў на галаву шапку танкіста. Што і раз у бар урываўся пасажыр і з ходу перакульваў шклянку гарэлкі. За барам увіхаліся задаволеныя жыццём афіцыянткі ў пышных лісіных шапках.

— Вы даже будете из Германии? — зачапілі нас вясёлыя кампаньёны за піўным столікам. — Это у вас по лицу я вижу, — аб'вясціў мне дзядзька ў шапцы танкіста. Калі мы назвалі Польшчу, у бары бухнула хваля добрасуседскай любові:

— Квасьнеўскі е добры хлопэць! — усклікнуў дзядзька — Каб не ён, то ўкраінцы яшчэ сто гадоў Маскву ў д… цалавалі б!

Паводле ягадзінскага *палітолага*, прэзідэнт Квасневускі не прыехаў у Кіеў з пустымі рукамі. Наадварот — ён прывёз Юшчанку мільярд долараў. Вось, чаму Юшчанка выйграў рэвалюцыю!

Калі мы збіраліся ўжо на аўтобус, за столікам ужо „судзілі" Кучму!

## Рэвалюцыя перасякае мяжу

Мяжу перасяклі мы з Аляксеем з Ковеля, маладым кантрабандыстам ад саляркі і заўзятым фанатам Юліі Тымашэнкі. Дзякуючы нам Аляксей прашыбаваў кардон без чаргі па паласе для палякаў (bo przewoził panie Polki).

У Польшчы ўжо асвойваюцца з Украінай. Калі ў мінулагодні ліпень мы падарожнічалі аўта-стопам на Украіну, польскім шафёрам ад уражання валасы дыбам падымаліся. Украіна явілася ім мафіяй, збродам, гвалтам. Зараз, калі такім жа шляхам і метадам мы дабіраліся ў Кіеў, нам спачувалі адно з прычыны марозу.

— Też się zastanawiam czy nie pojechać tam w wakacje, — паўтаралі менеджэры (яны найчасцей падвозяць) і, каб не быць горшымі, распавядалі пра свае эскапады па Іспаніі або Егіпце.

Прачуванні Васыля Л. наконт Аранжавай рэвалюцыі ў Беларусі таксама набываюць кшталт. Вось, пасля перасячэння польскай мяжы, чытаю ў „Выбарчай газеце" пра агульнабеларускі кангрэс. Яго мэта — назначыць саперніка Лукашэнку ў выбарах 2006 г. Інфармацыя падпіраецца доследамі Незалежнага інстытута грамадска-эканамічных і палітычных доследаў, які мяркуе, што ўжо большая частка беларусаў не хоча Аляксандра Лукашэнкі.

Кангрэс, па словах карэспандэнта, адбудзецца ўжо ў маі — у Кіеве.

**Ганна Кандрацюк**

## Я таксама шукаю спонсараў

У „Ніве” друкавалася ўжо другая аб’ява аб пошуках спонсараў. Гэтае моднае апошнім часам слова абазначае таго, хто мае грошы і хоча імі падзяліцца з іншымі. Але ці нам хто дапаможа?

Спонсараў можна заўважыць у тэлебачанні. Яны падтрымоўваюць шматлікія тэлетурніры, прагнозы пагоды, спартыўныя спаборніцтвы ці перадачы. Якая мне карысць з таго, што выйграе Малыш, які не падзеліцца з бедным, што мусіць пражыць за 350 зл. у месяц. Хто дапаможа 5 мільёнам беспрацоўным у краіне, якая дапамагае Іраку і плаціць узносы ў еўрасаюзную касу. Не дапамогуць нават артысты, якія „перамагаюць хвалю”, бо звычайна за свае канцэрты таксама бяруць шматтысячныя ганарары.

Спартсмен, які заваюе залаты медаль, атрымоўвае вялікую грашовую прэмію і мае гарантаваны выхад на спартыўную пенсію. А існуюць яшчэ ж парламенцкія, мундзірныя і невядомая якія пенсіі — адносна вялікія.

А нам абяцалі ліквідаваць стары „партфель”, але нічога не атрымалася і нам далей даводзіцца жыць на 600 зл. у месяц. Хто можа нам дапамагчы? Прэзідэнт ці прэм’ер? Пісаў я ім аб нашых галодных пенсіях, але, відаць, не хочуць яны чытаць маіх пісем. Каб маршалак Цімашэвіч чытаў „Ніву”, то можа адгукнуўся б. Я яму таксама два разы пісаў, але ён, відаць, па-беларуску чытаць не ўмее.

І мне, абяздоленаму пенсіянеру, таксама сняцца спонсары.

**Дзядзька Захар**

## Люты

*Месяц люты можа быць пякучы,*
*А зіма дзейнічае і працуе рашуча.*
*Пачатак снежня быў марозны,*
*Для жывога цела непакорны і злосны.*
*Пасля пацяплела нямнога,*
*Хаця цяжкая была палявая дарога —*
*Раскісла ў адно балота, і гэта зімой;*
*Мне, напрыклад, цяжка было*
*вяртацца дамоў.*
*І студзень быў цёплы, без снегу;*
*Жывёле, птушкам і нам —*
*палёгка і пацеха.*
*Ні то восень, ні то вясна,*
*Хаця яшчэ не пара і не красна.*
*Па-рознаму сюрпрыз зімы ацэньвалі*
*І магутнымі галасамі яе славілі.*
*Ды напэўна і слушна,*
*А калі грымнуць маразы,*
*супрацьстаяць будзем ім мужна.*
*Ужо Грамніцы!*
*Як кажуць — палавіна зіміцы.*
*Але ці гэта праўда і згодна?*
*Думаю: прымаўка прыгожая*
*і больш модная.*
*Бо, лічыць, больш паловы зімы*
*ўжо прайшло*
*І многа дзянькоў і ночак ужо ўцякло.*
*Дні выпіраюць ночы за дзверы,*
*А нам у галаву новыя думкі прыляцелі.*
*Добра, калі мы думаем па-цвярозаму,*
*Тады нашы перспектывы харошыя.*
*І не трэба падаць духам, калі мароз*
*прыпячэ —*
*Ён скора сам уцячэ.*

**Мікалай Панфілюк**

# Войнаўка: мяжа, пушча,




*Апусцела Войнаўка, якая калісь бурліла жыццём*

**Дабіраючыся ў Войнаўку Дубіцкай гміны доўгі час трэба ехаць лесам. Непадалёк дарогі валяецца галлё ад зрэзаных дрэў. Месцамі лес прарэджваецца. Побач вузкай шашы растуць маладыя бярозы і сосны. Відаць, што лес выкарыстоўваецца для гаспадарчых мэт. Перад Войнаўкай бачу мужчыну, які, мабыць, вяртаецца з пушчы. У напрамку мяжы з Беларуссю, якая праходзіць непадалёк ад вёскі, відаць адкрытую тэрыторыю. Мясцовыя жыхары выкарыстоўваюць яе на лугі і ворыва.**

Калі фатаграфую вёску, адчуваю, што застаюся незаўважаным. Хутчэй за ўсё людзі заняты сваёй хатняй работай і таму не відаць іх на вуліцы або панадворках. Заходжу ў мураваны дом, які вылучаецца сярод драўлянай забудовы. Ніна Саевіч тлумачыць, што ў вёсцы мала гаспадароў. Асноўную частку жыхароў Войнаўкі састаўляюць пенсіянеры. Некаторыя аддалі сваю зямлю і лес дзяржаве і зараз гаспадараць толькі на сваіх прысядзібных участках і ў агародчыках. Многія гаспадары апісалі зямлю дзецям і абраблялі яе покі хапіла сіл. Зараз такія палеткі або ляжаць аблогам, або зарастаюць лесам. Некалькі маладшых гаспадароў абрабляюць поле суседзяў. Аднак яны не рашыліся браць вялікія крэдыты і разгарнуць гадоўлю кароў або свіней.

— Калі ўзніклі пэгеэры, многа нашых жыхароў паехала туды на працу, — кажа Ніна Саевіч. Адным з іх быў Мікола Найбук. Пасяліўся ён на пастаяннае жыхарства ў дом, што належаў да пэгээра ў Новым Беразове. Летам працаваў камбайнерам, а вясной і восенню ездзіў на трактары. Араў, сеяў збожжа і выконваў іншыя сельскагаспадарчыя работы. На свята прыязджаў наведаць сямейнікаў. Зараз ён ужо не жыве, а яго бацькоўскі дом пустуе. Дзеці Міколы час ад часу наведваюць дом сваіх продкаў. Рэдка прыязджаюць іншыя выхадцы з Войнаўкі, якія паслухалі заклікаў улад Народнай Польшчы і паехалі працаваць у больш аддаленыя ад Гайнаўшчыны месцы. Дзеці некаторых з іх маюць магчымасць прыязджаць у Войнаўку на адпачынак. Аднак іх ужо не цягне сюды на пастаяннае жыхарства.

Спадарыня Ніна Саевіч дзяцінства правяла ў Казьмірове (каля Апакі), якое пасля ўстанаўлення дзяржаўнай мяжы апынулася ў Савецкім Саюзе. Паколькі поле аставалася ў Польшчы, сямейству спадарыні Ніны ўдалося пераехаць на пастаяннае жыхарства на польскі бок.

**— У Гайках усе будынкі будавалі мы з нуля і таму было нам вельмі цяжка. Былі там тры гаспадаркі, ад якіх было відаць мяжу. Зараз гэтых гаспадарак няма, а на былых панадворках расце лес. Разам з мужам прыйшлося будавацца другі раз у Войнаўцы, — успамінае спадарыня Ніна.**

Адразу пасля вайны ў Войнаўку прыязджалі савецкія вайскоўцы і намяўлялі выязджаць у Беларусь або ў Расію. Адзін жыхар задэкляраваўся на выезд у Савецкі Саюз і пасля ледзь здолеў выкупіцца гарэлкай у савецкага афіцэра.

**— Пасля вайны моцна пільнавалі мяжу і нават цяжка было падысці да яе. Спачатку мы думалі, што граніца адменіцца і таму шанавалі поле, якога ўласнікі былі за мяжой. Нашае поле, што засталося ў Савецкім Саюзе, таксама абраблялі, — гаворыць спадарыня Саевіч. — Нашыя жыхары рэдка ездзілі да сваякоў, што засталіся ў Беларусі. Зараз, калі лягчэй дабрацца за мяжу, няма ўжо да каго ехаць.** Найбліжэйшыя сваякі паўміралі або выехалі ў глыб Беларусі. Засталіся далейшыя сваякі, з якімі не ўтрымлівалі мы сувязей.

Землі вакол Войнаўкі малаякасныя і таму зараз малы прыбытак ад сельскагаспадарчай прадукцыі. Дзікі, алені і козы выядаюць каля лесу бульбу і збожжа.

— Увесь лес каля Войнаўкі меў быць запаведнікам, але яшчэ нічога з гэтага не атрымалася. Зараз найбольш праблем з дзікамі, якія перасталі баяцца людзей і сабак. Калі адзін раз статак дзікоў выйшаў на наша поле, мы палілі вогнішча і грукаталі дровамі, але яны не ўцякалі. Пасля пачалі бегчы на нас і мы ледзь іх завярнулі, — расказвае спадарыня Ніна.

**— Мы называем сябе беларусамі. Мова ў нас мякчэйшая ад гаворак, якія можна пачуць на поўдзень ад нас, — ад гаспадарчых праблем мая субяседніца пераходзіць да беларускіх спраў. Паведамляе, што купіла „Ніву” з календаром, якіх многа разышлося ў Войнаўцы. Некаторыя асобы купляюць „Ніву” пастаянна.**

У падставовай школе вучыцца з Войнаўкі толькі некалькі дзетак. Кожны дзень прыязджае за імі школьны аўтобус і пасля заняткаў адвозіць вучняў дамоў. У вёску два разы ўдзень прыязджае аўтобус з Гайнаўкі і два разы забірае ахвотных у горад. Некалькі асоб пастаянна дабіраецца з Войнаўкі ў царкву ў Вэрстоку. Іншыя жыхары ездзяць на богаслужэнні ў час больших святкаванняў. Святліцу паставілі ў Войнаўцы каля 20 гадоў назад. Раней спатыкалася ў ёй моладзь. Зараз старэйшыя жыхары, што асталіся жыць у вёсцы, сустракаюцца ў прыватных дамах. У памяшканні клуба быў адчынены прадуктовы магазін. Нядаўна пасля кантролю санэпідэмстанцыі быў ён закрыты. Аднак некалькі разоў у тыдзень прыязджаюць у вёску аб’язныя крамы з найбольш патрэбнымі таварамі. У Войнаўцы становіцца шматлюдна ў час летніх канікул. Прыязджаюць тады ўнукі, а ў выхадныя наведваюць іх бацькі.

— Многа разоў на дзень праязджаюць праз нашу вёску пагранічнікі. Днём і ноччу пільнуюць, каб ніхто не перайшоў праз мяжу. Часта ходзяць і ездзяць побач граніцы, — выяўляе вясковыя тайны старэйшая жыхарка Войнаўкі. Ёсць у яе час, каб наглядаць за машынамі, якія перамяшчаюцца праз вёску.

## Параўнанне

*Нядаўна сустрэў я каля нашай крамы дзядзьку Аляксандра Кірылюка, аб прабыванні якога на прымусовых работах ва Усходняй Прусіі, у дваццаці кіламетрах ад былой польска-нямецкай мяжы, я калісь пісаў у „Ніву”. Вось што ён мне сказаў:*

*— Ведай, Коля, што цяпер наша Польшча ў тэхнічным прагрэсе абагнала колішнюю Нямеччыну. Бо ў вёсцы, дзе я быў на прымусовых работах, сяляне жылі па-рознаму — і бедна, і багата. І розныя былі дамы ды гаспадарчыя будынкі, і галечы не бракавала; усе жыхары тае вёскі былі мазурамі і маглі свабодна гаварыць па-польску. Хаця пад канец, калі вясковы гаспадар задумаў будавацца, ён мусіў падпарадкавацца новым правілам: будынкі павінны былі быць вялікія і прасторныя, а гаспадар, бадай, меў абавязак наняць асобную фірму, якая яму на крэдыт магла ўсё — хату і будынкі — пабудаваць пад ключ. А той крэдыт быў размеркаваны на трыццаць гадоў і таму гаспадар не адчуваў цяжару пабудовы. У той вёсцы было тады толькі два трактары: адзін вялікі, а другі меншы — і гэта ўсё! А ў нас што? Кожны мае свой уласны трактар, а нават і два; значыць мы сёння багацейшыя за колішніх немцаў. У Германіі пакражаў не было і паліва ў бочках, машыны і прылады маглі быць на панадворку ці ў полі або на лузе і ніхто іх не чапаў.*

*Я падзякаваў дзядзьку Аляксандру за такія радасныя словы, што мы сёння багацейшыя за колішніх немцаў; мо гэта і праўда. Але трэба ведаць і тое, што Нямеччына ў той час ваявала амаль з цэлым светам. І цікава, ці Польшча мае столькі фабрык і заводаў, колькі мела тады Германія? Тысячы тых заводаў саветы пацягнулі да сябе пасля перамогі. А ў нас сёння што, хаця б з культурай і пашанай працы? Калі з панадворка або хаты ў белы дзень могуць усё ўкрасці, а з будовы за ноч могуць усе матэрыялы вывезці ў сінюю даль так, як укралі з поля той гайнаўскі танк-помнік. І чым маем хваліцца?*

**(мп)**

# асобны беларускі свет

**Размова з Янам САЕВІЧАМ з Войнаўкі, радным гміны Дубічы-Царкоўныя (выбраным ад Беларускага народнага выбарчага камітэта).**

***— Апошнія адміністрацыйныя рэформы спрычыніліся да большага выкарыстання падаткаў на тэрыторыі гміны, у якой знаходзіцца іх плацельшчык. Аднак адначасна паменшалі датацыі з цэнтральнага бюджэту для бяднейшых гмін. Ці пасля гэтых змен застаюцца сродкі ў бюджэце гміны Дубічы-Царкоўныя на інвестыцыі?***

— Наша гміна бедная. Увесь гмінны бюджэт — гэта каля 3 мільёнаў злотых. Яшчэ сплачваем крэдыты, якія бралі на будову школьнага будынка, ачышчальні сцёкаў і каналізацыі ў Дубічах. Палову грошай выдаткаваных на каналізацыю вернуць нам з фонду SAPARD. Апошнім часам мы будавалі каналізацыю ў Дубічах і канчалі асфальтаваць вуліцу ў Грабаўцы. Інвестыцыі на дарогах гэта наш прыярытэт. Аднак цяпер сродкі ў бюджэце дазваляюць толькі на невялікую мадэрнізацыю дарог. Два або тры разы ў год трэба раўняць гравійныя дарогі, якіх у гміне многа.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

***— Якія фінансавыя магчымасці ў гміне, каб у бліжэйшы час рэалізаваць новыя інвестыцыі?***

— Няма ўжо сродкаў на вялікія інвестыцыі. Мусілі б ізноў браць крэдыт, бо без яго нічога не зробім.

***— Можа ёсць магчымасць выкарыстання вонкавага капіталу на гмінныя праекты?***

— Вонкавыя сродкі пайшлі на даканчэнне асфальтавання дарогі, якая вядзе праз Войнаўку ў Старыну. Сродкі атрымалі мы пры нагодзе стварэння Дома сацыяльнай апекі ў Старыне.

***— У час адкрыцця гэтага дома апекі гаварылася пра магчымасці пасялення ў ім адзінокіх людзей з Дубіцкай гміны. Як гэта рэалізуецца на практыцы?***

— Толькі нядаўна Дом сацыяльнай апекі пачаў працаваць і жыве ў ім 5 пенсіянераў. Гэта асобы з пасляпэгээраўскіх дамоў. Можа ён прыняць да 30 асоб, але кошт апекі над адным чалавекам складае 1 600 злотых. Калі б жыхары нашай гміны хацелі там пасяліцца, то з гміннага бюджэту трэба было б даплачваць да невялікіх пенсій нашых людзей.

***— Якія бачыце перспектывы развіцця вашай гміны?***

— Думаю, што ёсць шанц на развіццё турызму. У нас Белавежская пушча і чыстае асяроддзе. Ёсць таксама шанц для дзейнасці агратурыстычных кватэр.

***— Ці дагэтуль турысты былі зацікаўлены адпачынкам у вашай гміне?***

— У Старыне былі выстаўлены на продаж будаўнічыя ўчасткі. Купілі іх жыхары з іншых рэгіёнаў Польшчы і будуюць там дамы. Каля вадасховішча Бахматы ўчасткі купляюць прыезджыя і будуюць на іх домікі для летняга адпачынку.

***— Ці многа людзей збіраецца каля вадасховішча?***

— Летам увесь час каля вадасховішча адпачываюць турысты. Паслугамі для гасцей займаецца Гмінны асяродак культуры.

***— Якія беларускія мерапрыемствы арганізаваў асяродак культуры?***

— Беларускія мерапрыемствы апошнім часам адбываліся ў школе.

***— Штораз больш маладых людзей інвестуе ў свае гаспадаркі. Якія ўмовы працы ў сельскай гаспадарцы ў Дубіцкай гміне?***

— Цяпер нашы вёскі пусцеюць і меншае ў іх колькасць моладзі. Людзі з-па-за нашага рэгіёна купляюць дамы і прыязджаюць летам на адпачынак. Землі ў нашай гміне слабой якасці, а мінеральнае ўгнаенне дарагое. Лясная звярына наносіць вялікія шкоды на палях. Людзі, што маюць палеткі каля пушчы, аблясяюць іх. Іншыя не абрабляюць зямлю побач пушчы і яна сама зарастае лесам.

***— Напэўна ёсць гаспадары, якія, нягледзячы на складаныя ўмовы, разгарнулі сельскагаспадарчую прадукцыю.***

— Ёсць у гміне некалькі гаспадароў, што выдатна пабольшалі свае гаспадаркі і разгарнулі прадукцыю. Напрыклад, Анатоль Чыквін з Вэрстока гадуе пад 30 кароў. На землях слабой якасці прадукцыя малака дае большы прыбытак, чым вырошчванне збожжа. Некаторыя маладыя гаспадары рашаюцца гаспадарыць, бо ў нас цяжка знайсці дадатковую работу. Большыя гаспадаркі ёсць у жыхароў Старога Корніна, дзе зямля лепшай якасці.

***— Ва ўсіх прыпушчанскіх гмінах Гайнаўскага павета апошнім часам выдаткоўвалі грошы на ахову паветра і зямлі вакол Белавежскай пушчы. Якія экалагічныя інвестыцыі праводзіліся ў вашай гміне?***

— Апошнім часам мы разбудоўвалі каналізацыю. Самі жыхары Дубіч настойвалі, каб іх падключыць да ачышчальні. Кацельні ў асяродку здароўя, будынку гміннай установы і жыллёвым блёку перароблены на маславае ацяпленне, што не забруджвае паветра так як вугаль. Не ведаю ці яшчэ нехта ў нашай гміне купляе вугаль для абагравання кватэр. Амаль кожны жыхар нашай гміны мае свой лес. Тыя пенсіянеры, што раней перадалі сваё поле з лесам дзяржаве, заказваюць дровы ў прыватных людзей.

***— Раскажыце крыху пра вашу прафесійную працу і сям'ю.***

— У мяне ёсць свая гаспадарка. Абрабляю 7 гектараў поля і гаспадарую на 10 гектарах лесу. Аднак у нашай частцы гміны землі вельмі слабой якасці. Бывае, што менш бульбы накапаем, чымсьці пасадзілі, бо апошнюю выядаюць дзікі. З прыбытку ад гаспадарання цяжка было б пракарміць сям'ю. Я зараз працую цывільным работнікам на Пагранзаставе ў Дубічах-Царкоўных. Раней працаваў я ў прадпрыемстве „Пронар" у Нарве, але многа часу і сродкаў траціў на даезды. Жонка Ірэна пачала працаваць у Доме сацыяльнай дапамогі ў Старыне. Ёсць у нас дачка Магдаліна.

***— Ці многа людзей з тэрыторыі Дубіцкай гміны знайшло работу на пагранзаставе?***

— Хіба большасць ахоўваючых мяжу састаўляюць прыезджыя асобы. Аднак прымаюць новых і паўлічваецца колькасць мясцовых работнікаў.

***— Якія зараз магчымасці знайсці працу ў вашай гміне?***

— Зараз вельмі цяжка знайсці ў нас новую работу. Некаторыя жыхары дарабляюць да сваіх гаспадарак і збіраюць грыбы. Калі мокрае лета, то за прададзеныя грыбы можна сабраць больш грошай, чым невялікая пенсія.

***— У мінулым годзе бура знішчыла вёску Елянка. Як гмінныя ўлады і жыхары гміны дапамаглі пацярпеўшым ад урагану?***

— На адбудову Елянкі многа сродкаў мы атрымалі ад прыватных людзей і прадпрыемстваў. З гміннага бюджэту таксама перадалі грошы. Мы, як гмінныя радныя, выдзелілі для пацярпеўшых ад буры па 3 нашы дыеты. Вайсковыя і цывільныя людзі ездзілі і памагалі грамадскім чынам.

***— Дзякую за размову.***

**Аляксей Мароз**

## Як нас бачаць

*У 50 н-ры „Нівы" ад 12 снежня 2004 года друкаваўся допіс Мікалая Панфілюка п.з. „Удавіная доля". Аўтар ставіць пад публічнае асуджэнне паводзіны жыхароў суседняй вёскі, якія без прычыны адмоўна ставяцца да ўдавы. Пагаджаюся з сябрам Панфілюком, што гэта негуманна, не пахрысціянску насміхацца з іншага чалавека. „Не смейся, братка, з чужога выпадку", — гавораць у народзе. Сёння мяне спасцігла бяда, заўтра цябе ліхое спаткае. Але ёсць іншая праўда. У сучаснай рэчаіснасці распаўсюджваецца паталагічная з'ява неталерантнасці. Неадпаведна складваюцца міжлюдскія суадносіны. Паўсюдна царыць вульгарнасць, грубасць, скажу проста — хамства.*

*На маю думку, грамадскасць павінна станоўча супрацоўнічаць паразітам. Пустазелле трэба загадзя вырываць з каранямі. Не ў кожнай вёсцы, аднак, сустракаем паршывых авечак. Ёсць асяроддзі, дзе належна фармуюцца міжлюдскія суадносіны. 3 лютага г.г. падарожнічаў я ў Беласток. У Чаромсе прыселася сяброўка з нашай вёскі, якая выйшла замуж у Левашы, што ў Мілейчыцкай гміне. Больш дзесяці гадоў яна жыве ўдавіцай. Муж памёр на інфаркт. Адзінока прыйшлося ёй займацца дочкамі. Усе тры выдала замуж. Для ўсіх памагла абяспечыцца кватэрамі. Вось, як успамінае яна мінулае.*

*— Кузаўцы бацькоў за людзей не лічылі. Батракі. Восем душ (нас шасцярых ды іх двое) нельга было пракарміць з кусочка пясчанага поля. Пасля бацька памёр. Матулі выпала на долю займацца нашай адукацыяй. Дзякуй Божай волі, тры браты і дзве сястрыцы знайшлі месца ў грамадскасці. Пажаніліся. Абзавяліся сем'ямі. Праўда, старэйшая сястра аўдавела. Брат памёр ды і мне не пашчасціла. Але не наракаю на свой лёс. Гаспадаркай займаюся. Каровку трымаю, чатыры свінкі падрастае. У мінулым годзе бульбы насадзіла. Абрадзіла. З дваццаці мяшочкаў саджанцаў трыста назбірала. Самой немагчыма было б справіцца. Дзякуй Богу, людзі памаглі. Сват з Баброўкі — душа чалавек. Гной вывез. Пры ўборцы ўраджаю памагае. Ды і аднавяскоўцы спагадлівыя людзі. Я ім памагаю, яны — мне. На ўборку бульбы аж васемнаццаць душ сабралася. Пасля гасцяваліся. Мужыкам так спадабалася, што рашылі ў наступным годзе прыйсці на бульбакапанне. Адной, як вядома, сумна ў прасторнай кватэры. Маглі б турысты летам прыехаць. Навакольны лес багаты грыбамі ды ягадамі. Прытым свежае паветра, экалагічнае харчаванне...*

**Уладзімір Сідарук**





*Рэктар Варшаўскага ўніверсітэта запрашае на даклад былога старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча „Пасля «Аранжавай рэвалюцыі» Беларусь?"*

*Auditorium Maximum*
*Krakowskie Przedmieście 26/28*
*22 лютага 2005 г., 17⁰⁰*



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК



*Зіма завітала і ў Беласток...*

# Зімовая прыгода мядзведзіка Таптыжкі

Прыйшла зіма ў лес. Паснулі вожыкі, барсукі. Заснула і мядзвежая сямейка ў сваёй бярлозе. Добра спалася ў ёй, але не ўсім. Аднойчы сярод зімы прачнуўся мядзведзік Таптыжка. Паглядзеў — мама мядзведзіха спіць. Адразу мільгнула думка: „Пайду ў лес, пагуляю! Бо тут — усё спі ды спі”... Адчыніў Таптыжка дзверы, азірнуўся — і за парог.

Ідзе ён па сцяжынках, па заснежаных пяньках ды купінках і думае: „З кім бы пагуляць?” Убачыў нару барсука.

— О-о, з барсуком я пагуляю! — узрадаваўся мядзведзік Таптыжка. — Барсук, уставай, гуляць будзем!

А барсук сонна мармыча:

— Што ўжо вясна прыйшла?

Таптыжка гучна рассмяяўся. А барсук высунуўся з нары, паглядзеў, хто яго трывожыць. Убачыў мядзведзіка ды кажа злосна:

— Чаго ты тут бадзяешся? Зімою мядзведзі спяць! Марш дадому!

Сумны мядзведзік Таптыжка паплёўся далей. Ідзе, ідзе... Раптам нешта вострае як увап’ецца ў нагу!

— Ай-ай! Ой-ой! Ай! Хто гэта ўкалоў мяне?

Зірнуў пад ногі — бачыць, што гэта вожык ляжыць у снезе. Спіць.

— Вожык ты чуеш мяне? Давай гуляць! — нахіліўся над ім мядзведзік Таптыжка.

— Не перашкаджай мне спаць... Дадому тупай... — буркнуў той незадаволены.

— І вожык са мною гуляць не хоча, — сумна ўздыхнуў мядзведзік Таптыжка. — Пайду пашукаю каго-небудзь яшчэ. Няўжо ўсе спяць у гэты час?

Рушыў далей па лесе. Выйшаў на палянку. І тут чуе, што нехта пад снегам корпаецца. Цікаўны Таптыжка засунуў лапу ў снезе... і выцягнуў цецерука за хвост. Толькі паспеў убачыць якія ў старога злосныя вочы, як кінуўся наўцёкі, пад ногі не гледзячы. Не заўважыў, калі апынуўся ў сваёй роднай бярлозе. Яшчэ і пад ложак схаваўся. Ведаў нораў старога цецерука: абавязкова матулі паскардзіцца.

Неўзабаве ў дзверы пастукаў цецярук. Мама мядзведзіха, якая прачнулася ад грукату, што нарабіў сын, адчыніла дзверы са словамі:

— Добры дзень шаноўны Цецер Цецеруковіч! У чым справа?

— Як? Вы не ведаеце, што ваш сын займаецца свавольствам?!

— Ах, вось чаго ён як апантаны ў хату ўляцеў! — усклікнула мама мядзведзіха і выцягнула свавольніка за вуха з-пад ложка. Каб не быў ён бурага колеру, то напэўна, пачырванеў бы.

— Прабачце, калі ласка, мне. Я больш ніколі-ніколі не буду так рабіць, — стаў жаласліва прасіцца Таптыжка. — Нікога не буду будзіць. І сам у зімку спаць буду...

— Ну, калі так, то хуценька ў ложак, — загадала маці.

— Спаць! — падхапіў стары Цецер Цецеруковіч.

З таго часу мядзведзь Таптыжка зімою толькі спаў. Не выходзіў з бярлогі да вясны.

***Аня Янцэвіч**, в. Кунаса, Нясвіжскі раён, Мінская вобласць — „Казкі дзяцей Беларусі”*

# Тайнік сэрцападобны

*(заканчэнне; пачатак у папярэднім нумары)*

Не. Падыдзе да каменя, нахіліцца, ды вяртаецца дадому. Што за чарадзейства?

Дадумалася кабета памацаць пад каменем, дзе схілялася яе дачка. А там, схаваная травой, у камяні — расколіна, а ў расколіне — паперка.

Замкнулі Алесю ў пакоі — хто ж зважае на дзявочыя слёзы? Бацькі, вядома, заўсёды лепш ведаюць, як іх дзецям будаваць сваё жыццё і з кім жыць. Дарэмна чакаў Мурат з двума самымі хуткімі коньмі ў прызначаным месцы. Чакаў, пакуль не пабачыў, што над вёскай каханай уздымаюцца слупы дыму.

Гэта не быў проста пажар. У чарговы раз на нашу зямлю напалі ворагі. Якая розніца, з Усходу яны былі, з Захаду або з Поўдня — аднолькава бязлітасна рабавалі, забівалі ды палілі, лічачы, што гэтая зямля мусіць належаць ім. У такія хвіліны не было ані конюха, ані півавара, ані каваля, ані шаўца — усе былі воі. Мужчыны і жанчыны побач уздымаліся на абарону сваіх дамоў. Але не заўсёды ўдавалася адстояць сваё. Вось і цяпер занадта дужае было войска, і чужынцы, прагныя да здабычы, пачалі ўзломвацца ў свірны і паграбы, хапаць прыгожых дзяўчат... Бацька Алесі яшчэ бараніў свой дом разам са сваімі работнікамі. Алеся дапамагала, як магла, але пачала ўжо болей спадзявацца на кінжал, схаваны на грудзях, які адзіны мог уберагчы ад ганьбы.

Але тут пачуўся шалёны пошчак коней і крыкі. Алеся вызірнула ў вузкае акенца — і сэрца яе закалацілася: на дапамогу суседзям скакалі жыхары вёскі за лесам, і наперадзе ехаў малады чарнявы хлопец, узброены шабляй.

Жыхары двух вёсак, аб'яднаўшыся, прагналі ворагаў. Вядома, шмат хто быў паранены, былі і загінуўшыя. Але сем'і Алесі і Мурата ацалелі. І хіба можна глядзець коса на таго, з кім плячо ў плячо біўся супраць смяротнай небяспекі? З бацькам Мурата і бацькам Алесі менавіта так і атрымалася. І хутка абедзьве вёскі гулялі на вяселлі.

Сям'я ў Алесі і Мурата атрымалася на зайздрасць усім — штогод па сыне. Было каму і піва варыць, і коней гадаваць.

Але ўспамін пра перажытае не знік. І калі вяселле ехала з аднае вёскі ў другую, маладыя папрасілі спыніцца ля каменя на раздарожжы, які быў сведкам і памочнікам іх кахання. І Алеся адшпіліла ад гарсэта белую ядвабную кветачку і паклала ў іх тайнік — няхай і камень даведаецца, як шчасліва скончылася гэтая гісторыя!

А на наступны год ля каменя вырасла кветка з пяшчотнымі белымі пялёсткамі і зялёнымі пругкімі лістамі, падобнымі на сэрцайкі. Адразу ў вёсцы пачалі гаварыць, што кветачка дапамагае ў сардэчных справах. Прыме дзяўчына яе ў падарунак — значыць, кахае.

Вось і назвалі яе тайнік сэрцападобны.

**Людміла Рублеўская**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Андрэй Мароз і Агнешка Швед



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аляксандра Каліна, VI клас

# Школьныя прылады

У заплечніку малой Каці згодна жылі з сабой усе школьныя прылады. Сярод іх быў клей, спіральная гумка, ручка, каляровыя алоўкі, цыркуль і лінейка. Аднойчы Каця пісала пісьмо сяброўцы, моцна націснула чырвоны аловак і ён паламаўся. Узяла тады Каця клей, добра склеіла аловак, і толькі маленькая рысачка напамінала аб тым, што з ім здарылася. І ўсе былі шчаслівыя.

У пятніцу Каця атрымала ў школе хатняе заданне — нарысаваць усе геаметрычныя фігуры. Дзяўчынка ўзялася за працу, але досыць неасцярожна — паламаліся ў яе аловак і лінейка. Каця доўга не сумавала. Узяла клей і хуценька склеіла школьныя прылады. І зноў усе былі шчаслівыя.

Аднак з клею, які так памагаў усім, амаль нічога не засталося. Школьныя прылады прыкмецілі гэта, але ніяк не маглі дапамагчы. І толькі Каця ведала, што ён не шкадаваў сябе, каб дапамагчы іншым. А клей, хаця ўжо паміраў сваёй унутранай пустотай, не шкадаваў сябе. Ведаў, што дзякуючы яму, маглі далей жыць школьныя сябры-прылады.

**Анна Садоўская**

# Польска-беларуская крыжаванка № 8

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 4:** Мароз, абзац, самавар, справа, покрыва, аўторак, корт, брат, плакса, котка, Іра. Маг, як, воўк, рой, торт, спор, чарка, Марк, Лі, бравы, бар, вавёрка, Ас, цырк, стан.

Узнагароды — аўтаматычныя алоўкі з гумкай маркі „Staedtler" — выйгралі: **Паўліна Чурак** з Арэшкава, **Паўліна Башун**, **Дыяна Капытка** і **Аня Анікіюк** з Чыжоў, **Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Дыяна Свірыдзюк** і **Пётр Саковіч** з Кленік, **Юстына Смольская** і **Магда Кандрацюк** з Наракі. Віншуем! Узнагароды можна ўзяць у рэдакцыі „Ніва" або чакаць іх у сваёй школе.

# Вершы Віктара Шведа

## Моўныя разважанні

*— Еду ў Амерыку з мамусяй*
*І прызнаюся што баюся.*
*— Якія боязі асновы?*
*— Зусім не ведаю іх мовы.*

*— Не пераймайся, дружа мілы,*
*Не траць з прычыны мовы сілы.*
*Яны ж, мой дарагі Адаме,*
*Нашай не ведаюць таксама.*

## Пагаворым як бацька з бацькам

*Бацька спытаў свайго сыночка:*
*— Чаму сумуюць твае вочкі?*
*Мо, нешта здарылася ў школе,*
*Што ты, сыночак, поўны болю?*

*— Болю не гэтая прычына.*
*— Дык пагаворым як бацька з сынам.*
*Адказ на гэта быў сынка Вацка?*
*— Мо, пагаворым як бацька з бацькам.*

*Зараз у тэлевізары ў Беларусі паўсюль усе ворагі — Еўропа, НАТА, а нават Украіна. Пра Польшчу змаўчу, але Прыбалтыка і ўсё астатнія — кепскія. Калі чалавек за гэтым сочыць (у мяне выключаны тэлевізар), яму ўжо даволі...*

# Аднак у Беларусі Ты — зорка (1)

**Гавораць, што пра музыку нельга гаварыць, трэба яе толькі слухаць. Цяжка з гэтым не згадзіцца, але гэтую музыку нехта стварае. Сядзіць кампазітар можа па начах, можа ў дзень, і прабуе аддаць свой настрой, свае думкі, пратэст супраць нечага ці проста хоча сказаць як яму добра. Не адзін раз прыйшлося мне задумоўвацца над тым хто стварыў песню „Рэчанька” ці „Купалінку”. Які быў гэты чалавек і як паводзіў сябе ў жыцці? Гэтага зараз не даведаемся. Можа ў далёкай будучыні створыцца магчымасць падарожнічаць у мінулае і знайсці гэтых людзей? Час пакажа. Сёння маем сучасных стваральнікаў песень, якія будуць яшчэ спявацца нашымі праўнукамі. Паколькі дадзена нам сужыць з імі, трэба з імі і паразмаўляць пра тое што робяць. Маім госцем і суразмоўцам з’яўляецца Лявон ВОЛЬСКІ з гурту „Н.Р.М.”, кіраўнік праекта „Крамбамбуля” і, як кажуць вядомыя музычныя крытыкі, заснавальнік гурту „ЗЭТ”.**





Рокмену і ў касцюме выдатна

*— Пачнём з „Н.Р.М.”. Гурт у мінулым годзе святкаваў 10 гадавіну з дня заснавання. Якімі былі тыя 10 гадоў?*

— Розныя былі часы, для „Н.Р.М.” усе яны добрыя і цікавыя. Мы адгукаліся на жыццё нашай краіны — Беларусі, жыццё нашай краіны — Незалежнай Рэспублікі Мроя. Зараз нават будзем праводзіць рэферэндум у „нашай краіне”. У нас 22 лютага канцэрт адбудзецца ў клубе, бо забаранілі нам выступаць у вялікіх залах. Не гучым на радыё і ў тэлебачанні, таму іграем па клубах. Наконт нашых супольных 10 гадоў... Былі яны розныя, бо і ў краіне было па-рознаму. У гэтага рэжыму былі і адлігі свае, і свае ўціскі. Зараз самы жорсткі час, бо ўлады нарэшце рыхтуюцца да прэзідэнцкіх выбараў. Загадалі радыёэфір у 75% зрабіць беларускім і забараняюць радыёстанцыям прэзентаваць нашу беларускую музыку. І такіх недарэчнасцей можна знайсці многа за гэты час.

*— А якую песню гурту „Н.Р.М.” лічыш самай удалай?*

— Песні, якія ідуць з канцэрта ў канцэрт, нівелююцца і мне ўжо яны не такія як спачатку. Такія бясспрэчныя гіты як „Песні пра каханне” ці „Тры чарапахі” немагчыма выкінуць з праграмы канцэрта і зараз не так яны падабаюцца нам як тады, калі ствараліся. Зараз вельмі цікава рабіць элітарныя канцэрты. Мы зрабілі ў Мінску канцэрт, на якім прадставілі песні, якіх зусім на канцэртах не граем. Людзі ведалі ўсе гэтыя песні. У час туру па Польшчы ўжо не было так добра. А гралі мы, між іншым, такія гіты як „Лепей не будзе” або „Я еду”. Вяртаючыся да пытання, я не магу сказаць, што маю любімую песню са свайго рэпертуару. Самыя цікавыя песні для выканаўцы — тыя, якія ствараюцца апошнімі.

*— Дык што зараз ствараецца гуртом „Н.Р.М.”?*

— Ідзе работа і ўсе нас прыспешваюць. Справа ў тым, што ўсё мусіць быць непрымушана і своечасова. Нельга гнаць план як на заводзе. Гэта несур’ёзнае „кляпаць” па тры песні ўдзень. Мы маральна рыхтуемся да новага альбома, матэрыялу шмат. Нам трэба два спакойныя тыдні, каб сабрацца і асэнсаваць той матэрыял. Трэба каб усё гэта даспела.

*— Давай пагутарым пра пачаткі „Н.Р.М.”.*

— Напрыканцы 1994 года, дакладна ў лістападзе, мы стварыліся як „Н.Р.М.”. У 1995 годзе, амаль год пасля стварэння, выдалі альбом „Лалалала”, у якім амаль самыя гіты... Гэта быў пошук. Мы яшчэ не ведалі, у якім накірунку рухацца.

*— Ці ўдалося гурту „Н.Р.М.” на працягу існавання знайсці той накірунак?*

— Знайшлі мы накірунак, які заключаецца ў адсутнасці накірунку. Можам рабіць крок назад, уперад, налева, направа. Мы не з’яўляемся прадуктам папулярнай музыкі, ані дзяржаўным прадуктам. Ёсць закіды, што мы — папсовая каманда. Рабілі мы розныя ў той бок крокі. Здымалі кліпы і, паколькі было магчымае, круцілі мы іх па беларускіх СМІ. Вядома — бессэнсоўна працаваць для сцяны або вузкаму асяроддзю слухачоў. Ці гэта папса? Каб мы мелі болей доступу да масмедыяў, напэўна зрабілі б болей.

*— Бракуе нармальнасці ў Беларусі?*

— Ужо даўно!

*— „Н.Р.М.” гэта таксама вялікі праект у сетцы Інтэрнэт. Вы стварылі сваю „Незалежную Рэспубліку Мроя” і маеце сваіх жыхароў. Кожны жыхар мае пашпарт. Колькі пашпартоў налічвае „Н.Р.М.”?*



Лявон Вольскі гэта ці Джым Морысан?

— Напэўна некалькі тысяч. Зараз у Інтэрнэце ў нас маленькі застой, бо вэб-майстар у Маскве. Неяк цяжка яму ажыццявіць наш рэферэндум. Кажа, што забыў. Хочам таксама зрабіць перапашпартызацыю і ў канцы канцоў прыняць канстытуцыю. Думаю, у бліжэйшы час гэтым якраз будзем займацца.

*— Лявон Вольскі гэта не толькі „Н.Р.М.”. Ты неад’емная частка праекта „Крамбамбуля”, у якой зараз вельмі добры і спрыяльны час...*

— Мы выдалі максі-сінгл (такая тысяча дробязей). На кружэлцы сем песень і многа мелодый на тэлефонныя апараты — паліфанічных і манафанічных, нават модныя зараз файлы караокэ. Вялікая галерэя і амаль усе відэакліпы. Матэрыял называецца „Радыё «Крамбамбуля» 0,33 ФМ”. Паколькі не вельмі нас дапускаюць да беларускага радыё, мы вырашылі зрабіць сваё радыё. Трэба сказаць, што „Крамбамбуля” — гэта праект абсалютна для адпачынку. Гэта праект пазітыва, таму што зараз негатываў аж надта. І гэты негатыў не толькі ад рок музыкі ідзе, таму што гэта натуральна. Зараз у тэлевізары ў Беларусі паўсюль усе ворагі — Еўропа, НАТА, а нават Украіна. Пра Польшчу змаўчу, але Прыбалтыка і ўсё астатнія — кепскія. Калі чалавек за гэтым сочыць (у мяне выключаны тэлевізар), яму ўжо даволі. Трэба яму сарганізаваць застольную бяседу, тады ягоная ўвага адцягнецца ад кепскага. Ну і мы так зрабілі. Вось тры „Крамбамбулі”. Першая была далучэннем Беларусі да сусветнага гласарыя. Шмат хто дазнаўся, што існуе напой „Крамбамбуля”, які дайшоў да нас з часоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Адна прыватная фірма нават выпускала той напой, а ў Маскве адчыніўся рэстаран пад гэтым назовам. Зараз алкагольным сімвалам Беларусі становіцца тая „Крамбамбуля”. Чарговая „Крамбамбуля” была ў дваровай стылістыцы. Знайшліся там смешныя тэмы 1960-1970-х гадоў. Пачалі мы інтэграцыю беларускіх музыкаў, якія ніколі раней не перакрыжоўваліся ў творчасці. З намі выступіў Сяргей Міхалкоў з вядомага па ўсёй Расіі гурту „Ляпіс Трубяцкой”, Алесь Кулінковіч з „Неўра Дубэль”.



Лявон Вольскі на руках у маці

*(заканчэнне гутаркі праз тыдзень)*

**Лукаш Сцепанюк**

**Усе здымкі www.nrm.by.com**

# Расквітнела беларуская песня

**Паспяхова развіваецца беларуская песенная самадзейнасць на Беласточчыне. У апошнім дзесяцігоддзі калектывы дасягнулі высокага мастацкага ўзроўню. Спрыяюць гэтаму штогадовыя дафестывальныя спаборніцтвы ды Агульнапольскі фестываль беларускай песні, удзел у якім спевакі лічаць вялікім гонарам.**

У адборачным павятовым аглядзе XII Агульнапольскага фестывалю „Беларуская песня 2005” у Беластоку 6 лютага ўдзельнічала дванаццаць харавых калектываў, у тым ліку шэсць з Беластока і шэсць з Беластоцкага павета (тры з Гарадка і па адным з Козлікаў, Залук і Агароднічкаў). У спаборніцтва ўступіла дваццаць адна мастацкая адзінка.

Старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі адкрываючы ўрачыстасць сказаў, між іншым, што ГП БГКТ ад пачатку свайго існавання многа ўвагі ўдзяляла развіццю беларускай культуры, у тым ліку і папулярызацыі беларускай песні ўсімі даступнымі яму спосабамі, затым сардэчна прывітаў удзельнікаў адборачнага агляду, членаў журы — Андрэя Такаюка (старшыня), Нэлю Панько і Андрэя Данільчука, любіцеляў роднай песні, гасцей, у тым ліку віцэ-консула РБ у Беластоку Н. Ярмоленку.

Канцэртныя спаборніцтвы павялі Ева Ласкевіч і Яраслаў Якімюк. Першым на сцэну выйшаў хор БГКТ „Крыніца” пад мастацкім кіраўніцтвам Віктара Маланчыка. Выступілі мужчынская і жаночая групы хору, а таксама дуэт Яўген Матвяюк і Аляксандр Максімовіч. Выканалі яны па дзве песні і заслужана былі ўзнагароджаны бурнымі апладысментамі.

Маладзёжны хор БГКТ „Каласкі” пад кіраўніцтвам Алы Каменскай выступаў два разы. Пачаткова заспявала група дзяўчын у прыгожых народных строях, а затым увесь калектыў. У іх співе адчувалася сімпатычная бадзёрасць маладосці.

Пад артыстычным кіраўніцтвам Алы Каменскай, таксама паспяхова, выступіў дваццаціасабовы хор „Паліфанія” з Беластока. Вылучаўся ён з ліку ўсіх гуртоў чорнымі касцюмамі. Захапілі яны беластачан песняй „Радзіма мая дарагая”.

Вакальна-інструментальны маладзёжны калектыў БГКТ з Беластока „Лучына” пад мастацкім кіраўніцтвам Гражыны Валкавыцкай таксама выклікаў захапленне ў прысутных. Праспяваў ён, у адпаведнасці з рэгламентам, дзве песні з асаблівым тэмпераментам і радаснай энергіяй. Песня „На вуліцы мокра...” гучэла неяк па-новаму, амаль прафесійна. Касцюмы „Лучыны” вылучаліся колерам і арнаментам.

Эстрадны гурт „Лідэр” з Беластока, якім кіруе Міраслаў Кавальскі, заўсёды трымае належны мастацкі ўзровень. У песні „Рэкруты”, у якой гучаць словы „сэрца б'ецца, хочацца жыць”, адчувалася, што спевакам хочацца жыць з песняй, спяваць для людзей і славіць беларускую песню.

Эстрадны гурт „Зорка” з Беластока, пад кіраўніцтвам Яна Карнілюка, належна справіўся з мастацкімі патрабаваннямі рэгламенту конкурсу. Беласток прадстаўляў яшчэ галасісты дуэт Альжбета Пятэльская і Анна Садоўская з сумнымі песнямі аб няшчасным каханні.



*Беластоцкі хор „Крыніца”*

Прэзентацыю калектываў Беластоцкага павета пачаў „Расспяваны Гарадок” — сяміасабовы хор, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Віктар Маланчык. У гэтых жанчын варта падкрэсліць адну важную прыкмету — на іх тварах відаць задавальненне, радасць і сімпатычную ўсмешку. А ў песні „Бочачка” выявілі яны яшчэ спрытнасць да танца.

Вакальна-інструментальны калектыў „Асенні ліст” пад дырыжорствам Віктара Леанкевіча таксама дастойна запісаўся ў гісторыю конкурсу. Песні „Чорныя вочкі” і „Родная вёска” выдатна выканалі дзевяць жанчын і трох мужчын-музыкантаў.

Дуэты Янка і Ірэна Карповічы, а таксама Ларыса Абрамовіч і Вера Лукошык адпаведна зарэкамендавалі сябе і атрымалі ад публікі бурныя воплескі. Ларыса Абрамовіч у асноўным любіць песні напоўненыя чалавечым горам. Такой менавіта была фальклорная песня „Нешчаслівая любоў”. Моцны голас напоўнены трагізмам расказаў аб маладым чалавеку, які спрычыніўся да смерці дзяўчыны, а пасля з гора па ёй сам утапіўся. Песня ў слухачоў выклікала слёзы.

Затым выступілі „Жураўнікі” з Агароднічак, якімі кіруе Ніна Аўгустыновіч. У іх хоры восем асоб. Не хапае ім музыканта. Але яны даюць сабе рады і без акампанементу.

Пасля вядучыя канцэрт папрасілі на сцэну харавы калектыў „Каліна” з вёскі Залукі, які працуе пад музычным кіраўніцтвам згаданага ўжо Віктара Леанкевіча.

Жаночы сяміасабовы калектыў „Рэчанька” з вёскі Козлікі, дзе жыве Ала Каменская, выканаў песні „Сонца зайшло” і „Ой, не пажар гарыць”. Ала Каменская выступіла таксама ў дуэце з маці, Любай Гаўрылюк. Песня „Не шукай ты мяне” ў іх выкананні расплывалася па зале, быццам духоўная асалода, быццам нейкая нябачная сіла, якая кранала за сэрца.

Адборачны канцэрт прайшоў на высокім мастацкім узроўні і працягваўся чатыры гадзіны. Яшчэ адну гадзіну працягваліся пазаконкурсныя выступленні, калі журы пайшло ацаняць выканаўцаў. З выступаючых 21 артыстычнай адзінкі 15 з іх атрымалі першыя, другія і трэція месцы і прымуць удзел у цэнтральных элімінацыях 27 лютага. Тады з найлепшых будуць выбраны выканаўцы на гала-канцэрт, які адбудзецца 5 сакавіка ў клубе „Влукняж” у Беластоку.

**Міхась Хмялеўскі**

# „Пад ціхі шум твайго верацяна...”

## *Пра кнігу выбраных твораў Анатоля Бярозкі*

Кнігу „Выбранае” Анатоля Бярозкі прыслаў мне з Мінска Анатоль Белы. Менавіта ён з'яўляецца ўкладальнікам гэтай цікавай і арыгінальнай кніжкі беларускага паэта, перакладчыка, публіцыста, доктара медыцыны, які цяпер жыве ў ЗША.

Імя Анатоля Бярозкі (Мацьвея Рэпкава-Смаршчка) стала вядома беларускаму чытачу яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, калі ён свае першыя вершы пачаў друкаваць на старонках заходнебеларускіх часопісаў „Шлях моладзі” і „Калосьсе”. Таму перш чым уважліва прачытаць гэтае выданне, дастаў я з кніжнай паліцы сваёй прыватнай бібліятэкі некалькі нумароў „Калосься” за 1935-1939 гады. І, сапраўды, амаль у кожным нумары часопіса змешчаны вершы Анатоля Бярозкі. У часопісе „Калосьсе” за 1935 год (кніжка 2, стар. 88) чытаю:

*Пад ціхі шум твайго верацяна*
*Снуюцца думкі плоймамі густымі —*
*Узоры ткуць ў лучыны сінім дыме*
*І ўецца ніць, як тонкая струна.*

Якія выдатныя радкі! Які вобраз! Толькі паэт ад Бога можа намаляваць такі просты, але паэтычна яркі малюнак. А ў „Калосьсі” за 1936 год (кніжка 2, стар. 88) аўтар тужліва-далікатна распавядае, як *Тысячай зор палымяных неба ўпілося ў барозны,// Ў ціхія хаты... ў жорсткія рукі... ў чорны іх хлеб і соль...// Шэрыя хаты, цяжкія рукі — маўклівы і грозны:// Гэтак ціха маўчаць умее толькі магутны боль.*

Чытаючы творы паэта, звярнуў я ўвагу на адну акалічнасць. Амаль кожны верш пачынаецца з вельмі моцнага, адметна-вобразнага і філасофскага радка. Кожны такі радок застаўляе дачытаць верш да канца. Вось некалькі першых радкоў з розных вершаў паэта: „Ноч павісла над соннай зямлёй...”, „Ціхутка траўнёвая ноч падышла...”, „Умурзаны месяц выпаўз на мутнае неба...”, „Я люблю цябе, вечар, за цень перажытага дня...”, „Сягодня патухла тваё акно...” і г.д.

Усе калосьсеўскія і шляхамаладзеўскія вершы Анатоля Бярозкі ўвайшлі ў кнігу „Выбранае”, а таксама вершы з яго першага паэтычнага зборніка „Адзінаццаць вершаў” (Мантыселя, ЗША, 1989 г.).

Кніга Анатоля Бярозкі прыцягвае ўвагу яшчэ тым, што акрамя вершаў у ёй змешчаны цікавыя ўспаміны аўтара пра Язэпа Пушчу і пра Лявона Луцкевіча, а таксама пераклады вершаў з літоўскай і англійскай моў на беларускую. Наогул, складальнік кнігі Анатоль Белы падышоў да гэтай працы вельмі сур'ёзна і прафесійна. Сюды ён уключыў не толькі літаратурныя творы Анатоля Бярозкі, але і артыкулы пра яго жыццё і творчасць, фотаздымкі розных гадоў і бібліяграфічны паказальнік. Атрымалася своеасаблівая маленькая энцыклапедыя жыцця і творчасці беларуса на эміграцыі. Нічога сюды не трапіла лішняга і нічога не ўпушчана.



У мінулым годзе Беларускае гістарычнае таварыства ў Беластоку выпусціла асобнаю кнігаю гістарычныя нарысы Міколы Шкялёнка „Беларусь і суседзі”. На працягу шмат гадоў збіраць звесткі пра гэтага выдатнага і забытага беларускага гісторыка і яго працы даваліся мне. І калі кніга была напісана і складзена — знайшоўся яе фундатар. Гэта ніхто іншы, як Мацьвей Рэпкаў-Смаршчок. Так склаўся лёс, што вайна і сталінскія рэпрэсіі разлучылі двух віленскіх сяброў. А ў тыя далёкія 30-я гады яны былі актыўнымі супрацоўнікамі часопіса „Калосьсе”, нават уваходзілі ў рэдакцыйную калегію. І хто мог падумаць, што Міколу Шкялёнка бальшавікі расстраляюць у 1946 годзе ў Курапатах пад Мінскам, а Мацьвей Рэпкаў-Смаршчок усё жыццё пражыве далёка ад сваёй Бацькаўшчыны. А праз 70 гадоў адзін з іх выдаткуе грошы, каб патрымаць у руках і прачытаць выдатную гістарычную кнігу свайго сябра. „Кніга гэтая высакаякасная і важная ды, безумоўна, заслугоўвае публікацыі, як ацэніць яе кожны, хто яе прачытае” — напісаў мне ў адным з лістоў спадар Рэпкаў-Смаршчок.

19 лютага Анатолю Бярозку споўніцца 90 гадоў. Верыцца, што разам з ім літаратурная Беларусь адзначыць гэты шаноўны юбілей і, кажучы словамі паэта, няхай яшчэ не хутка „парвуцца струны” і не „замоўкне яго звонкая ліра”.

**Сяргей Чыгрын**

*Школьны штомесячнік „Звон" выдаецца ў старадаўнім і слаўным горадзе Магілёве. Дзякуючы сусветнай павуціне мы можам пазнаёміцца з яго інтэрнэтнай версіяй...*

# http://zvon.at.tut.by

Калі цікаўны віртуальны вандроўнік набярэ на сваім маніторы адрас http://zvon.at.tut.by, то перад ягонымі вачыма адкрыецца нібыта сапраўдная газетная старонка. Уверсе назва з выяўленнем звана і эпіграф з верша Міхася Чарота: „Зазвані моцна, звон, загудзі, //Каб пачулі цябе на ўвесь край.//Беларуса хутчэй разбудзі,//Хоць цяпер яму спаць ты не дай!". Гэтыя словы — своеасаблівая прадмова да таго, аб чым пішуць хлопцы і дзяўчаты ў „Звоне".

Як і належыць інтэрнэтнай версіі — з левага боку выйсці да рубрык. Першая „Галоўная". На яе трапляем адразу пасля таго, як увядзем адрас. Тут невялічкія нататкі з жыцця Магілёва, якія, на думку рэдакцыі „Звона", будуць цікаўныя падлеткам і моладзі. Свайго роду падборка навінных паведамленняў.

Наступная рубрыка — „У нумары". Яна распавядае пра тыя фельетоны і артыкулы, якія можна таксама прачытаць у друкаваным варыянце газеты. Найбольш цікавым падаецца расповед пра літаратурнае аб'яднанне, што дзейнічае ў адной з гарадскіх школ. „Дзеці яшчэ не вельмі добра ведаюць беларускую граматыку, але ўжо добра пішуць вершы на беларускай мове. На пытанне чаму па-беларуску, я пачуў такі адказ: „На беларускай мове прасцей, на рускай не ідзе". Так што не ўсё страчана на ўсходзе Беларусі ў плане захавання беларушчыны да лепшых для яе часоў.

Старонка „Беларускі гістарычны каляндар" змяшчае ў сабе галоўныя падзеі, што адбыліся ў нашым мінулым цягам апошніх гадоў, дзесяцігоддзяў і стагоддзяў. Відаць, па задумцы рэдакцыі, гэты каляндар мусіў быць адпаведным месяцу, у якім выходзіў нумар. Але чамусьці адзіны пералік гістарычных з'яў тычыцца толькі снежня. Іншых няма.

Вельмі цікавай падаецца рубрыка „Нататкі з падарожжа". Два невялічкія апавяданні апісваюць прыроду і не толькі беларускую. Яны нечым нагадваюць расповеды для дзяцей і падлеткаў, што вядуцца ад імя якога-небудзь звера, ці ўвогуле нейкай стыхіі.

Рубрыка „Music" гаворыць сама за сябе ўласнай назвай. У ёй можна сустрэць артыкулы пра разнастайныя музычныя гурты, што пэўна ёсць цікаўным падлеткам-меламанам. Чытаючы першы артыкул пачынаеш разумець, што старадаўняя музыка на новы лад, якую грае ўзгаданы калісьці на старонках „Нівы" „Стары Ольса", становіцца ў беларускай моладзі даволі папулярнай. Аб гэтым сведчыць і апісаны ў „Звоне" магілёўскі гурт „Osimira", што грае так званы фольк-мадэрн і нядаўна выпусціў кампакт-дыск пад назвай „Прошча" з цікавымі словамі на вокладцы: „Паклон усім нашым Продкам, бабулям, дзядулям, пяшчотным рукам нашых матуляў ды блакітным вачам нашых бацькоў. Мы цалуем цябе, Родная Зямля!"

Рубрыка „www" распавядае пра Інтэрнэт, але ў даволі нязвыклы спосаб — апісваючы дзейнасць хакераў. Але што ж зробіш — кожная выназходка прагрэсу нараджае і тых, хто ставіць яе на службу злачыннасці.

Далей ідуць „анкетныя даныя" ў рубрыцы „Ад рэдакцыі". З іх можна даведацца, што газету выдае магілёўскае грамадскае аб'яднанне „Гісторыка". Выхад на яе сайт таксама прысутнічае з левага боку „званаўскай" старонкі, але чамусьці не адкрываецца.

Ну і апошняй рубрыкай вартай нашай увагі падаецца „Архіў". Праўда, тут таксама з адкрываннем праблемы — прачытаць можна толькі шосты нумар, хаця цалкам — ён змешчаны ў фармаце pdf.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Футбольная дружына Беларусі яшчэ больш павысіла свой рэйтынг, перамогшы ў спарынгавай гульні ў гасцях зборную Польшчы — 3:1...*

# Беларусь, беларусы...

**Здзек лёсу**

Люты пачаўся даволі паспяхова для беларускіх нацыянальных дружын. На пачатку вызначылася зборная Беларусі па хакеі з мячом. На чэмпіянаце свету, які праходзіў у сталіцы Татарстана Казані, яна перамагла ў спаборы дывізіёна „В". Нашы хакеісты адолелі Венгрыю, Эстонію, Нідэрланды і па серыі пенальці Канаду. Больш таго, у пераходным матчы за права гуляць у эліце, беларусы ўзялі верх над амерыканцамі — 6:3.

Гэта можна лічыць значным дасягненнем, паколькі ў Беларусі бэндзі (другая назва гульні) не асабліва культывуецца. Так чэмпіянат краіны не праводзіцца і ёсць толькі тры клубныя каманды.

Футбольная дружына Беларусі яшчэ больш павысіла свой рэйтынг, перамогшы ў спарынгавай гульні ў гасцях зборную Польшчы — 3:1. У шыхт вярнуўся Аляксандр Глеб і гэта адразу адбілася на патэнцыяле каманды. У прыблізна роўнай гульні весялей глядзеліся беларусы, паўабарона якіх была мабільнейшай. А браты Глебы пацвердзілі рэпутацыю спецыялістаў па польскіх рэпрэзентацыях. Цяпер на роўні нацыянальных дружын Беларусь мае перавагу над „бела-чырвонымі".

Але асноўная ўвага беларускіх заўзятараў была скіравана на хакейны кваліфікацыйны турнір да турынскай алімпіяды, што прайшоў у Рызе. Чатыры каманды змагаліся за адзіную пуцёўку ў Італію. Перад турнірам беларусы страцілі з-за траўмаў некалькіх патрэбных гульцоў — форвардаў Уладзіміра Цыплакова і Андрэя Скабелку. А галкіпера Андрэя Мезіна не захацеў адпускаць расійскі клуб. Так што за брамніцкую пазіцыю было трывожна, што і пацвердзіла першая гульня з Польшчай. Сяргей Шабанаў на апошняй лініі абароны пачуваўся не зусім упэўнена. Да таго ж беларусы, маючы значную перавагу (што яскрава выяўлялася ў колькасці кідкоў) кепска рэалізоўвалі галявыя магчымасці. Дадатковай пікантнасці гульні надаваў факт супрацьдзеяння трэнераў Міхаіла Захарава і Андрэя Сідарэнкі (калісьці „Захар"-хакеіст арганізаваў у беларускай дружыне змену галоўнага трэнера Сідарэнкі). Беларусы ўсё ж давялі сваю перавагу ў класе да лагічнага зыходу — 3:2 (агульны баланс сустрэч — 9 гульняў: 8 перамог беларусаў і адна палякаў).

Другая гульня са славенцамі для нашых пачалася цяжка, але скончылася пераканаўчай вікторыяй — 7:2. Горкім прысмакам, аднак, стала страта капітана Руслана Салея, якому шайба сур'ёзна пашкодзіла вока. Мажліва, менавіта лідэра не хапіла беларусам у трагічным па зыходзе матчы з латышамі. У апошнім паядынку нашых задавальняла нават нічыя. Беларусы гулялі лепш гаспадароў лёду, здолеўшы, здавалася, пераадолець і сапернікаў, і неаб'ектыўны арбітраж. Але пры ліку 4:2 у карысць падначаленых Міхаіла Захарава за некалькі хвілін да канца здарылася неверагоднае. Калі ўсе ў Беларусі ўжо рыхтаваліся святкаваць агульны поспех, наша каманда літаральна „рассыпалася" і прапусціла тры шайбы запар (!). Нібы адначасна надышло псіхалагічнае і фізічнае здранцвенне. Нейкімі гульнёвымі катэгорыямі такую фатальную метамарфозу не растлумачыш. У выніку горкая, як наш беларускі лёс, параза. Турынская алімпійская мара развеялася нібы дым.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

**Сабачая доля**

*Дзень быў надзвычай халодны. Вецер сыпаў снегам у вочы, залазіў пад вопратку, прадзьмуваў аж да касцей. Лепш вайна чым такое надвор'е. З прывакзальнай гродзенскай крамы з касмічна-непрыгожай назвай „Спутнік" выйшаў мужчына. Без шапкі, без пальчатак, расхрыстаны. Здаецца, ён не заўважаў настырных здзекаў надвор'я над людзьмі. З кішэні даволі салíднай, дарагой, але ўжо добра заношанай курткі тарчэла толькі што купленая бутэлька гарэлкі. Позірк у мужчыны быў да болю сумны, патухшы, як у алкаголіка, якому доктар-сваяк сказаў: „Будзеш піць — здохнеш".*

*Мужчына падышоў да прывакзальнага шапіка, купіў гарачую курыцу-грыль, адну аднаразовую шклянку і прысеў на лаўку недалёка ад чыгуначнага вакзала.*

*— Як жыць далей?! — спытаў ён у самога сябе, наліў поўную шклянку гарэлкі і раздзёр пакет з курыцай. — Вось жа доля сабачая!*

*Ды не паспеў ён замоўкнуць, як з-пад лаўкі вылез худы галодны сабака. Выгляд у яго быў мала аптымістычнейшы чым у чалавека. Трасучыся ад холаду, сабака з надзеяй глянуў у вочы чалавеку. Іх позіркі перасякліся і абодва зразумелі — сам лёс звёў іх сёння, каб не дай Бог не загінуць з роспачы.*

*Чалавек узяў курыцу, сунуў яе цалкам сабаку ў зубы, а сам, зморшчыўшыся, нібы ў шклянцы была серная кіслата, выпіў, нічым не закусваючы гарэлку. Сабака зразумеў, што забіраць курыцу ніхто не будзе, адышоўся недзе трохі далей чым на метра паўтары, і, павесялеўшы, стаў набівáць страўнік курацінай. А чалавек, пасля трэцяга кілішка, зноў загаварыў. Толькі на гэты раз з сабакам.*

*— Ну што, небарака, замёрз? Шкада што ты не п'еш. Дапамагае. Ад усяго. І ад холаду таксама. Хоць гэта і не сама вялікая бяда — холад. Шкада, не ведаю як цябе клічуць. Мяне Міхась. Са Смаргоні я. Ніколі не быў там? А дарма. Горад прыгожы. Прыязджай калі-небудзь. Эх, праблемы ў мяне, сабачка. Працую я кантрабандыстам. Ужо даўно. Як перастаў працаваць Смаргоньскі трактарны завод. Недзе ж трэба браць грошы. На пачатку цягалі скуры ў Польшчу вазіў. Добра зараблял. Ды раскусілі мяне мытнікі. Перайшоў на спірт. Таксама добра было. Ды вось нейкая паласа пайшла чорная. На літоўскай мяжы злавілі, усё забралі. Потым злавілі нашыя. Амаль усе грошы на штраф пайшлі. Вырашыў легальным бізнесам заняцца. Што, думаю, вечна мне цягацца і баяцца? Ці я сабака? Прабач, хвастаты. Заплаціў я за дазвол і ганяў машыны з-за мяжы. Падаткі плаціў. Але ў канцы года мне яшчэ нейкі падатак налічылі. Ды такі, што ў мяне вочы на лоб палезлі. Стаю, як акамянелы дыназаўр. Не магу ніяк уцяміць як гэта падатак можа быць у некалькі разоў больш не толькі чым прыбытак, але і за ўсе ўкладзеныя ў справу грошы. Карацей кажучы — застаўся з нічым. А тут дзеці нечакана падраслі. Спінагрызы. Усё больш і больш патрабуюць. З сынам яшчэ не так складана. Ён кажа, каб купіў яму камп'ютэр і адпусцілі ад мяне на паўгода. А з дзяўчатамі — бяда. Дзве ў мяне. На танцы хочуць апранацца прыгожа. Жонка душыць як вяроўка на карку. Кажа, што іншыя дзеці ўсё маюць, а мае дулю з макам. Вось і круціся як хочаш.*

*— Не было ў мяне выйсця, — працягваў свой сумны аповед чалавек. — Вырашыў зноў нелегальшчынай заняцца. Пазычаў грошы ў добрых людзей і ў Польшчу з кантрабандай. Ды зноў не пашанцавала. Як кажуць — дзе тонка, там і рвецца. Спачатку злавілі палякі. І прасіў я іх, і маліў. Бяду сваю расказаў шчыра, як бацюшку на споведзі. Ды дзе там. Тавар забралі, ды яшчэ штраф далі. На рэшту, што засталася, купіў я ў Польшчы золата. Хоць штраф адраблю, думаю. Ды на нашай мяжы мытніца папалася — звер у спадніцы. Усё забрала. Я ёй пра свае праблемы расказваю. Думаю, можа зразумее. А яна смяецца толькі. Кажа, што мае праблемы, гэта яе прэмія. Засудзілі мяне і ўсё забралі. Яшчэ мушу штраф плаціць ды пазыкі аддаваць. Як я ў Смаргонь прыеду? Што дзецям скажу?*

*— Што, п'ём у публічным месцы? — у адзін голас закрычалі выскачыўшыя як чорт з балота два міліцыянеры. — Грамадзянін, ідзіце з намі. Такое беспакарана вам з рук не зыдзе.*

*— Хлопцы, праблемы ў мяне... — хацеў пачаць зноў свой аповед Міхась.*

*— Нас вашы праблемы не цікавяць, — перабіў яго міліцыянер. — А не хочаце ісці добраахвотна — пойдзеце пад прымусам.*

*Міліцыянеры ў імгненне закруцілі Міхасю рукі. Сабака хацеў бараніць свайго карміцеля. Нават забрахаў. Але як дастаў нагой па мордзе і дубінай па хрыбце, лёг ля недаедзенай курыцы і сумна сачыў, як людзі валакуць некуды па снезе свайго двухногага брата. Цяпер ужо сабака нічога не разумеў у паводзінах людзей. „Сабачая ў тагго чалавека доля" — падумаў бы ён, каб сабакі маглі думаць. А можа і могуць. Хто іх ведае, сабак.*

**Сымон Нальшанскі**

# Прадалі ўсё разам з намі

Марозны лютаўскі дзень. Асляпляе сонца. Аўтобус едзе ў бок мяжы, спачатку па расчышчанай шашы „першай чарговасці адснежвання”, пасля калываецца сярод гурбаў на ледавіковых пагорках, дзе расселіся вёскі, пазначаныя дзе-нідзе высокім дымком з камінoў. Жывуць людзі, хоць амаль нікога на вуліцы. Едзем у Ярылаўку, дзе чакае ўжо Ян Камінскі, а разам з ім сусед, які нарыхтаваў вогнішча. Салідны касцёр з тоўстымі сухімі паленамі чаромхі, чарэшні, яблыні... Ян, услаўляльнік жывое правінцыі, набыў сабе кавалачак новае малое айчыны. Бывае там зрэдчас, а сусед ягоны — Валодзя Чыжэўскі, пільнуе дабытку.

— Раблю тут, як у сябе, — кажа, папраўляючы чорную аблавушку. — Аднойчы ехаў я на сваім роварчыку, бачу, крыюць дах. Заглянуў. І цяпер маю ўжо занятак. Хату, як аднавіў, пільную. Была яшчэ адна падобная хата ў нашай вёсцы, пры якой рабіў я 13 месяцаў, на поўны штат. Гаспадыня з мужам мела прадпрыемства ў Беластоку, рабілі мэталёвыя покрыўкі да лічыльнікаў. Мела тут яна бацькоў. Памерлі. Нічога не засталося бацькоўскага, дык хату тут пабудавала. Салідную, новую. Не паспела сярэдзіну кончыць. Муж памёр, засталіся даўгі. Каморнік сеў на прадпрыемства, заняў таксама гэты дом. І мусіць яна цяпер на жыццё зарабляць у Бельгіі. А меркавала, мабыць, тут жыць на старасць. Я рабіў у яе, пасля дастаў на паўгода куранёўку. А цяпер нейкія сто злотых атрымліваю ўспамогі. Каб выжыць.

Валодзя махае рукой на думку прасям’ю. Як усе кавалеры, якіх плойма па вёсках.

— Жаніцца? Не мой узрост (1956 год?!). Ну, ёсць праблема. Калі няма пастаяннага даходу, дык чаго сабе пару шукаць! Каб удвох бедаваць? Ды і так кабет няма. Адны ўдовы. Старэнькія, памагчы ім трэба. Казлоўскія, Леніны (Глагоўскай) бацькі, вось там, унізе што жывуць, неяк трымаюцца. Жывуць у Ярылаўцы Севярыны, Шапелі, Цярэшкі...



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Вёска Ярылаўка

У вёсцы хат з 15 будзе, пару на хутарах. Вёска разварушваецца ўлетку і ў школьныя канікулы...

Адкуль у Ярылаўцы ўзяўся Валодзя Чыжэўскі, які і па-польску ўмее, і па-нашаму? Нарадзіўся ён пад Кентшынам, бацькі прывезлі яго сюды ў пятнаццацігадовым узросце. Маці Марыя з Дарашкевічаў паходзіла з Коматаўцаў, бацька Мікола — з Крушынян. Паехалі былі „ў Прусы” за працай, рабілі ў пэгеэры. Там ім нарадзіліся дзеці. Вярнуліся ў 1970-я, спачатку заехалі да Марысінай маці ў Коматаўцы. Якую работу мець можна „калгаснiку”? Сезонную, з віламі. Бабуля „выгрызла” „дармаедаў” у паўтары месяца. Запрапанавалі работу Чыжэўскім у Лужанах. Стаў бацька Мікола пастухом. А гэтую вось хатку, што за кустоўем ды кучкай дрэў, лужанскі кааператыў сам трымаў у арэндзе. Пасяліў там тры сям’і. Тыя суседзі з’ехалі, Мікола чатырнаццаць гадоў таму як памёр, Марыя восем гадоў як спачыла на коматаўскім могільніку, і Валодзя застаўся адзін.

— Вы сустрэлі маю сястру, ведаю, бо ў „Ніве” была яна на здымку, казала мне адна чытачка з Коматаўцаў. Яна жыве ў вёсцы М., і ўсё патрабуе ад мяне: „Дай спадчыну па бацьках!”. А якую спадчыну маглі яны пакінуць! Жылі ў чужой хаце на чужой зямлі. Спачатку нас вучылі, нічога не нажылі, а што заробіш віламі! Лёс такі прапашчы. А папрасіў яе: купі баначку фарбы, чорнай і сіняй, каб на магілцы бацькоў таблічкі паправіць, дык і не прывезла, і на Провады не прыехала. Добра, што Ян прывёз з Беластока фарбу, дык я там усё акуратна паправіў. Памятка хай хоць будзе такая, што людзі жылі, што іх не забылі.



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Валодзя Чыжэўскі: Жаніцца? Не мой узрост. Ну, ёсць праблема...

Во, дзікі ходзяць. Валодзя Яну абгарадзіў падворак, і Ян таксама браўся за малаток. Людскі чалавек, гэты Ян. Плануе зрабіць хатнюю ачышчальню сцёкаў, каб не забруджваць прыроду, казаў, гэта каштуе няшмат. А сам Валодзя пасадзіў быў два мяшкі бульбы на палетку, дык дзікі перарылі ўсё, з 3 на 4 ліпеня. Заявіў аб гэтым войту, паляўнічаму гуртку, нават і ваяводу. Ваюе. Нават рэдактар Дарота Куц прыехала з беластоцкага тэлебачання. А ў Валодзі на гэты кавалачак няма ніякага права ўласнасці, дык ніякай кампенсацыі быць не можа. Было гэта ўласнасцю лужанскага кааператыва. Не мае за што купіць гэтую хату ейны жыхар. Дык што, мае здыхаць? — пытаецца рытарычна.

— А цяпер гэты кавалачак хтосьці купіў. Я нават яго на вочы не бачыў. Купіў ад Агенцтва сельскагаспадарчай уласнасці ў Сувалках. Будзе ўжо тры гады, як з зямлёй купілі і мяне. І я не ведаў бы, калі б не прасіўся памагчы аднавіць крыху маю разваліну. Домік мой няладны, з коцікам адно там жыву. Чорны, з белай латкай. Вылечыў я яго. Акуратны, хітры такі. Разумеемся мы з ім без слоў. Шмат гаварыць трэба са зверам, хоць гэта каму збоку здасца можа смешным... А ноччу хтосьці кругом хаты хадзіў, ён мяне асцярог, разбудзіў. Казаў я памежнікам, што хтосьці тут начамі каля хатаў лазіць. Ды што тут украсці!

„Рускія”, праўда, заязджаюць штодзень, возяць тое-сёе. Праверaны, кажуць, тавар. Найбольш „жыўнасці” прывозяць. Крамы свае ў Ярылаўцы няма, але з Саколкі прыязджаюць у пятніцу аб’язныя крамы, а ў чацвер — аўтобус з таварам. Усё можна купіць, абы грошы...

**Міра Лукша**

# *Грошы не пахнуць*

Яўген нарадзіўся ў сялянскай сям’і. Меў старэйшую сястру Палагію. Бацькі моцна стараліся, каб дзеці атрымалі сярэднюю або вышэйшую адукацыю і ў будучыні жылі ды працавалі ў горадзе. Як задумалі, так і збылося ў жыцці. Дачка закончыла вышэйшую адукацыю і цяпер жыве ў Беластоку. Бацька купіў ёй кватэру ў блёку, самаход і яна, вялікая пані, калі з мужам ды дзеткамі прыедзе да бацькоў у вёску, то не ведае, як граблі выглядаюць.

Сын Яўген закончыў сярэднюю адукацыю і стаў працаваць у адным з беластоцкіх прадпрыемстваў. Бацька і яму купіў кватэру. Аднойчы сынок прыехаў да бацькоў і расшуча заявіў, што будзе жаніцца з Рыгоравай Соняй, дзяўчынай з суседняй вёскі. Бацькі моцна ўзбурыліся, калі даведаліся, што дзяўчына бедная, нічога не мае. Але Яўген вымушаны быў жаніцца, бо Соня зацяжарыла. Згулялі вяселле і жылі шчасліва. Нарадзілася ў іх трое дзетак, адно па адным. Соня была спрытная, старалася як магла, каб прыдбаць нешта для дому ды дагадзіць свёкрам. Калі дзеткі крыху падраслі, Соня, каб падзарабіць грошай, паехала працаваць у Бельгію, а муж і працаваў, і дзетак даглядаў, не крыўдзіў. Вярнулася Соня з-за мяжы, прывезла многа грошай. Купілі яны ўчастак зямлі пад будову новага дома. Але ж не хапала грошай на будову і Соня зноў была вымушана паехаць за граніцу працаваць.

Суседзі ды сябры Яўгена гаварылі, што, мабыць, Соня за мяжой гандлюе „жывым таварам” і таму так многа прывозіць грошай. Тады Яўген ім адказаў, што гэта не мыла, не змыліцца і як на вадзе — знаку не будзе, абы толькі не прывезла ў люльцы, а адно „зялёныя”!

Ездзіла Соня яшчэ некалькі разоў за граніцу працаваць і заўсёды вярталася з добрым эфектам. Цяпер і свёкры шануюць Соню за яе гаспадарнасць, і муж шчаслівы, што пабудавалі свой катэдж і жывуць усе вельмі добра.

А Соня зноў збіраецца паехаць за граніцу папрацаваць.

**Мікалай Лук’янюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 914 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# „На родзіну”

*Ганна К., пасля шматгадовых блуканняў, перш за ўсё ў Інтэрнэце, знайшла радню. Бо вучоная кабета, бывалая ў свеце, крыху загубленая ў рэальнасці. Як усе, каму інтэрнэт-старонкі больш „рэаль”, чым сапраўдная рэальнасць. Як універсітэцкая выкладчыца вышэйшай матэматыкі, разлічвала яна на лічбы і невыпадковасць. Бо ў матэматыцы, матцы ўсіх навук, нават выпадковасць — знак гармоніі, суладдзя. Найбольш невыпадковым здалося Ганне К. ейнае прозвішча, бо, вось, бацькоў сабе не выбіраеш. Прозвішча давяло яе да нашых зямель тутэйшых, да аднае гібеючай ужо вёсачкі ў Беластоцкім павеце, славутай сваёй гісторыяй і цікавымі людзьмі, якія і араць умелі, і верш напісаць, і карціну намаляваць, якую ў свеце паказаць варта. Бо знайшла Ганна К., капаючыся ў радаслоўнай, сярод выхадцаў з вёскі М., больш за пяцьсотгадовай, знакамітых продкаў знакамітых людзей. Аказалася, усе тут сваякі. Ганна К., дакапаўшыся да дакументаў, распытваючы дзе магла, расліпала ўсю вёску — дзе хто жыў, хто чый брат ці сват. І атрымалася, што яе найбліжэйшыя сваякі жылі ў пяці хатах, з якой дзве дагніваюць пустыя.*

*Зачасціла Ганна К. у „сваю” вёску. З выгляду — „старая” ўжо дзеўка, за сорак, з рукзачком, у штанах, з кідкай чарнявасцю спелай красы, магла б „расходавацца” гурмою кавалераў, але быццам і не падыходзіла. Завучоная. А на руцэ пярсцёначак, мусіць, чыясьці нарачоная. Дзівачка. Ходзіць па вёсцы, распытвае, хто за каго выходзіў, калі хто дзе памёр. Справа падазроная: хоча чагосьці. Заначавала раз-другі ў сваяка, а пасля ўзялася прыбіраць у адной разваленай халупе. Перакапала гарышча, пазбірала якіясь паперы, здымкі. Анучы ды смецце спаліла ў печы. Памыла вокны, падлогі, паладзіла дзверы. Заначавала ў бязлюднай хаце.*

*Праз тыдзень у забытай хаціне пасяліўся са сваім камп’ютэрам трыццацігадовы сваяк, які жыў з сям’ёй сваё замужняе шматдзетнае сястры. Прыехала Ганна К. у „сваю” хату з рукзачком, напакаваным цацкамі і падарункамі сваёй новаадкрытай радні, з торбай з падушкай ды пасцеллю. А за камп’ютэрам у хаціне сядзіць Яська К. і разам з суседам б’е в’ентамцаў у амерыканскай гульні.*

*— Ты, чаго прыехала?! — пацікавіўся Яська.*

*— А, пажыць крыху! — белазуба ўсміхнулася цётка, бо гэтак прыходзілася Ганна К. мала маладзейшаму ад яе сваяку.*

*Яська раптам выбег з хаты, пабег у сястрыную, дзе на вячорках сядзелі бабы. Скансультаваўшыся, вярнуўся. Сусед моўчкі далей вёў налёт амерыканскімі бамбавозамі на в’етнамскія вёскі.*

*Яська схапіў цётчыны торбы і выбег на двор.*

*— Вон, пайшла! Тут няма нічога твайго! — кінуўся на Ганну К., але неяк не атрымлівалася — быў меншы ад яе на пайгалавы. — А ты мяне не чапай, бо я хворы! У мяне і ныркі хворыя, і пячонка! Я лячуся!*

*Ад тлумачэнняў Яські К. Ганне К., дзе яе месца, засталіся ў тае сінякі на ўсім целе, падбітае вока, апухлая пячонка — сваяк біў яе перш за ўсё ў грудзі ды жывот. Кінула была яна торбы на падворку свайго дзеда і ўцякла. Ноччу намог ёй пазбіраць манаткі іншы сваяк. А хата, у якой царыць Яськаў камп’ютэр, у якім можна адной кнопкай спляжыць усю вёску, загнівае далей.*

**Лукаш Правасуд**



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Балван ці снежная баба?*

# „Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Гутараць мастакі:

— Я, каб пражыць, п’ю шампанскае і малюю краявіды, — кажа першы.

— А я п’ю віно і малюю жанчын, — кажа другі.

— А я п’ю самагонку і малюю кватэры, — кажа трэці.

* * *

Яна і ён пазнаёміліся ў кавярні. Прыемна з сабою пагутарылі і ён запрасіў яе на кватэру. Выпілі вінко і ён запрапанаваў ёй пайсці ў пасцель.

— Ведаеш, — кажа яна, — можа я дзіўная і старасвецкая, але я кіруюся прынцыпам, якога не хачу парушыць: хачу астацца цнатлівай, пакуль не спаткаю мужчыны, каторага пакахаю.

— Так-так, — кажа ён расчараваны, — гэта вельмі прыгожы пункт погляду. Толькі ў сённяшні час, мабыць, табе вельмі цяжка яго трымацца?

— Гэта мне занадта не перашкаджае, толькі мой муж бялее ад злосці.

* * *

Па чыгунцы ў малым мястэчку прамчаўся цягнік. Пасажыр пытае загадчыка станцыі:

— Куды паехаў той поезд?

— У Еўропу.

— А адкуль гэта ведаеце?

— Бо ў нас не спыніўся.

# Адгаданка

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | К | 11 | 4 | | 17 | 9 | |
| | | | | 15 | 14 | 19 | А | | | | | | |
| | | | | | | | Л | | 3 | 18 | 10 | 12 | |
| | | 2 | 6 | | 7 | | Г | | | | | | |
| | | | | | | | А | | 8 | 5 | | 20 | |
| | | 16 | | 13 | 1 | | С | | | | | | |

* кавальская прылада, звязаная з чэмпіянатам свету ў Арэшкаве;

* рэха, водгулле, водгук;

* сутаргавы выдых з хрыпам і шумам (бывае сухі);

* летні лагер для аўтатурыстаў;

* ядомы пласціністы грыб жоўтага колеру, якога не любяць чарвякі;

* хваёвая суседка тундры. **(ш)**

Выяўленыя літары дапоўніць адгаданымі словамі, апісанні якіх прыведзены ў выпадковым парадку. Упарадкаваныя літары з пазначаных курсівам палёў складуць рашэнне — народную прыкмету.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 2 нумара**

Рашэнне: **Вавілонскае стоўпатварэнне.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

# 20.02 – 26.02

**Баран (21.03. — 19.04.)** 20 — 24.02. — удалыя падарожжы. Добра складуцца кантакты з атачэннем. Да 23.02. шмат замяшання ў сужонстве. Твая патрэба дамінавання — усяму прычына. Поўня Месяца (24.02.) увядзе цябе ў нервы.

**Бык (20.04. — 20.05.)** 20 — 24.02. будзеш уздзейнічаць на партнёра як магніт. У інтымных сувязях — жарсці і глыбіня пачуццяў. Да 22.02. асаблівая цяга да алкаголю і смачнай ежы, ды кепскае самаадчуванне маеш гарантаванае.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Поўня Месяца не гарантуе табе добрага настрою. Можаш адчуваць сябе разбітым і раздражненым, а хатнія будуць табе ўзлазіць на галаву. Можа адкрыцца нейкая сямейная таямніца. Лічацца твая бліскучая інтэлігентнасць, шырокія гарызонты і ўмеласць падкрэсліць твае перавагі, пачуццё гумару.

**Рак (22.06. — 22.07.)** 23 — 27.02. зможаш паказаць сваю кемлівасць, а нават трапіцца табе нейкае вынаходства. Раптам геніяльная развязка паможа табе справіцца з важнай праблемай. З 24.02. нейкае замяшанне, загарышся да якогасьці праекта, а з таго можа быць пшык. Круцялі толькі чакаюць твайго неразважлівага кроку.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Можа паявіцца нейкая новая крыніца прыбыткаў, можа таксама хтосьці абдараваць цябе грашыма ці нейкай дарагой рэччу. Спрабуй шчасця ў латарэі. Акунешся ў сямейныя справы. Работа гарыць табе ў руках. Чым больш дасі з сябе, тым больш атрымаеш.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** 20 — 24.02. — хуткія і трапныя рашэнні. Няма такое справы, з якою не справішся. Ужо ведаеш, хто табе наканаваны. Удалыя бяседы. Калі штосьці не атрымліваецца, думай пазітыўна.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Пачатак шалёнага кахання — 20 — 24.02. Краса і сексапіль. Каля 22.02. — сямейныя непаладкі, не ўсё пойдзе так, як хочаш. Не душы ў сабе злосці. Не наракай на паводзіны іншых, бо не паможаш.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** 20 — 24.02. можаш трапіць на вельмі цікавае знаёмства. Знакаміты час для фінансаў. Да 23.02. старайся з нікім не супернічаць. Каханне прынясе пачуццё эмацыянальнай бяспекі, матэрыяльную стабілізацыю і здзяйсненне духовых патрэб.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Не ангажуйся занадта ў прафесійныя справы. Важныя размовы адкладзі на пазней. З 24.02. не ўпірайся пры сваіх поглядах. Памятай аб кліматах — вячэра пры свечках...

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Поўня Месяца (24.02.) можа паблытаць твае планы звязаныя з падарожжамі. З 25.02. добры час на важныя размовы. Шмат энергіі, якая гоніць да дзейнасці, але і раздражняе.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Зможаш увесці змены, аб якіх здаўна марыў. Шанц на значную папраўу ўмоў жыцця. Да 22.02. дзейнічай дыпламатычна. З 24.02. многа нерваў; не рашай сур’ёзных спраў.

**Рыбы (19.02. — 20.03.)** Расчаруюць цябе паводзіны кагосьці з блізкіх. Правер, ці ведаеш усе акалічнасці сітуацыі. У тваім жыцці можа паявіцца хтосьці важны.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960